PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 12 (2445) Год XLVIII | Беласток, 23 сакавіка 2003 г. | Цана 2,00 зл.

X Агульнапольскі фестываль „Беларуская песня 2003” у Беластоку

Спяванне нясе радасць

Янка Целушэцкі

Сёлета Беларускае грамадска-культурнае таварыства арганізавала X Фестываль „Беларуская песня 2003”. Адбыўся ён пад ганаровым патранатам Владзімежа Цімашэвіча, міністра замежных спраў РП ды Польскага радыё і Польскага тэлебачання ў Беластоку. У суботу 8 сакавіка ладзілі гала-канцэрт сёлетняга Фестывалю ў вялікім зале клуба „Влукняж” у Беластоку.

Было гэта адно з тых найбольш імпазантных культурных мерапрыемстваў БГКТ. Падчас канцэрта выступіла 29 хораў, калектываў, вакальна-інструментальных гуртоў, дуэтаў і салістаў. Былі гэта лаўрэаты Фестывалю „Беларуская песня 2003” ды — таму, што быў гэта якраз юбілейны Фестываль — некаторыя лаўрэаты з папярэдніх гадоў. Для выступаючых самадзейнікаў гэта найважнейшы дзень у цэлым годзе. Яны могуць паказацца шырокай публіцы. Спяваў на сцэне таксама Дзяржаўны акадэмічны хор імя Генадзя Цітовіча з Мінска, мастацкім кіраўніком якога з'яўляецца праф. Міхась Дрынеўскі.

Публіка была шматлюдная, некалькітысячная. Зацікаўленне блізкай сэрцу роднай беларускай песняй надзвычай вялікае. Во, якое запатрабаванне на сустрэчы з беларускай песняй!

Канцэрт удастоілі, між іншым, епіскап Беластоцка-Гданьскі Іакаў, віцэ-міністр замежных спраў РП Анджэй Залуцкі (міністр Владзімеж Цімашэвіч якраз наносіў візіт у Аўстралію і Новую Зеландыю), пасол РП у Беларусі Тадэвуш Паўляк, пасол РБ у Польшчы Павел Латушка, дэпутаты Сейма РП Барбара Цірук, Генавефа Вісьнёўская і Яўген Чыквін, падляшскі ваявода Марэк

Малгажата Карпюк з Гайнаўскага белліцэя

[працяг ☞ 3]

Свята беларусаў

Яўген Мірановіч

25 Сакавіка як святочны дзень адзначае ў свеце некалькі соцень тысяч чалавек, якія адчуваюць сябе людзьмі беларускай культуры. Найбольш святкуе ў самой Беларусі, у якой ад 13 гадоў гэтая дата з'яўляецца сімвалам імкнення да самастойнасці і незалежнасці краіны. Адзначаюць 25 Сакавіка перш за ўсё тыя грамадзяне рэспублікі, якія не хочуць быць членамі расійскай супольнасці народаў. Свая мова, свая дзяржава, свая зямля, на якой ніхто не прымушае цябе станавіцца тым, кім ты не хочаш быць — гэта мэта кожнага народа. Парадаксальна, у Беларусі такую патрэбу адчувае знакамітая меншасць грамадства. Гісторыя краіны — гэта доўгія стагоддзі, на працягу якіх беларусы на сваёй зямлі вымушаны былі будаваць помнікі сваім каланізатарам, пісаць гімны ў пахвалу захопніцкім генералам. У такіх умовах не вырастае нармальнае грамадства. Ва ўмовах акупацыі фарміруецца нацыя прыстасаванцаў, людзей, якія хочуць неяк пражыць, а пасля ўсяго „людзьмі звацца”. Таму ні ў чым не вінаваты беларускі люд, што не з'яўляецца ён беларускім народам. Яго выхоўвалі — часта жорсткімі метадамі — быць кімсьці іншым. Хацелася б сказаць і болей — хвала гэтаму люду і за тое, што не пераўтварыўся ў рускіх або палякаў ды ўсё яшчэ выдае сотні тысяч патрыётаў.

У нас, на Беласточчыне, 25 Сакавіка адчуваць святочным днём будзе таксама некалькі соцень чалавек. Сярод праваслаўнай масы палякаў, рускіх і тутэйшых засталіся яшчэ два дзесяткі тысяч, якія лічаць сябе беларусамі. Не ўсе яны аднак эмацыянальна звязаныя з ідэйным зместам 25 Сакавіка, не ўсім белчырвона-белы сцяг і Пагоня асацыююцца з незалежніцкімі імкненнямі продкаў, а хутчэй — з антылукашэнкаўскімі дэманстрацыямі. На Беласточчыне святкуе перш за ўсё пакаленне, якому толькі што пачынаюць сівець валасы. Прайшло яно працэс самаадукацыі ў структурах узніклага ў 80-я гады Беларускага аб'яднання студэнтаў, эпоху рэвалюцыйнага рамантызму, бунту супраць акасцянелага бэгэкатоўска-камуністычнага ўзору нацыянальнага жыцця. Хутка аднак усё вярнулася ў норму. Бэгэкатызацыя ахапіла і пастарэлых рэвалюцыянераў, і наймалодшых актывістаў. Засталася аднак дата-сімвал, сімвал маладосці, імкнення да чагосьці вялікага і адчування салідарнасці з людзьмі гэтай самай культуры расцярушанымі ва ўсім свеце.

Ад 85 гадоў сакавіцкае свята адзначалі палітычныя эмігранты, якія вымушаны былі пакінуць сваю „абяцаную зямлю” — Беларусь. Для іх сакавіцкія сімвалы вызначалі кірунак палітычнай актыўнасці, а 25 Сакавіка было найважнейшай датай у календары. Для большасці сны пра незалежную Бацькаўшчыну ніколі не споўніліся. Шматлікія адыходзілі са свету не будучы ўпэўненымі, ці іхняя ахвярнасць мела які-небудзь сэнс.

85 гадоў таму прадстаўнікі беларускага народа аб'явілі волю жыць на сваёй зямлі пад сваёй уладай. У Беларусі стаялі нямецкія войскі, расіяне і палякі рыхтаваліся ўключыць беларускія землі ў склад сваіх калоній. Пастанова Рады Беларускай Народнай Рэспублікі была інфармацыяй для ўсіх акупантаў — не хочам вас у Беларусі. Але воля элітаў гэта надта мала, каб зямля і народ сталі свабоднымі. Патрэбны былі сот-

[працяг ☞ 2]

Запрашэньне

Беларускі Саюз у Рэчы Паспалітай запрашае на ўрачыстае сьвяткаваньне 85-ай гадавіны абвяшчэньня Беларускай Народнай Рэспублікі. Мерапрыемства адбудзецца 23 сакавіка (нядзеля) у 13 гадзін у Беластоку ў кавярні „Фама”, вул. Легіяновая, 5. У праграме прадбачваецца канцэртная частка. Уступ свабодны.

Арганізатары

Купцы контра супермаркет ☞ 3

Радныя патрабавалі вызначыць палітыку развіцця паслуг у горадзе і прапанавалі, каб рэвізійная камісія спраўдзіла, ці бурмістр правільна прадаваў гарадскі ўчастак пад будову маркета. На разгляд быў прадстаўлены праект гарадской пастановы, якая забараняла б будову ў горадзе магазінаў з гандлёвай плошчай большай за 400 квадратных метраў.

І я ў справе Рывінгейт! ☞ 4

А пра *Rywingate* выказваюцца ўсе медыі. А што цікава можа быць для чытача „Нівы”? Гэты вядомы ў свеце фільмавы прадзюсер нарадзіўся ў Беларусі, хоць гэта не мае ніякага дачынення да спробы атрымання хабару.

У Еўропе аднолькавых шанцаў ☞ 5

З гэтага нумара пачынаем рэалізацыю праекта „У Еўропе аднолькавых шанцаў”. У яго рамках надрукуем цыкл з 12 артыкулаў, прысвечаных нацыянальным меншасцям у краінах Еўрапейскага Саюза і Польшчы. Да кожнага артыкула прыкладзена будзе конкурснае пытанне.

Перформер У. Караткевіч ☞ 9

У 1965 годзе на старонках нашага тыднёвіка друкаваліся вершы і фатаграфія літаратара з мядзведзем. Нашы чытачы палічылі Караткевіча „белавежцам” ды журналістам „Нівы”. Пасля ў Мінску хадзілі чуткі — як тут у „Ніве” мы не маглі адбіцца ад званкоў. Нам дзень і ноч званілі і пыталі пра звяра. Многія жадалі пабачыць мядзведзя на ўласныя вочы, прыносілі ў рэдакцыю мёд, ласункі.

Трахім-музыка ☞ 10

Заявіў Трахім аб пакражы ў міліцыю, а сам стаў ездзіць у Беласток на базар і наглядаць за гандлярамі. Аднойчы заўважыў свой акардэон і выклікаў міліцыю. Трахімавы „Гохнер” меў сакрэтныя паметкі вядомыя толькі ўладальніку. Злодзеем аказаўся жыхар Бахуроў.

9 770546 196000

Беларусь — беларусы

Беларускі Саюз у Рэчы Паспалітай віншуе ўсіх беларусаў са сьвятам беларускай незалежнасьці — 85-ай гадавінай абвяшчэньня Беларускай Народнай Рэспублікі. Мы верым, што нашая духоўная Бацькаўшчына будзе незалежнай, дэмакратычнай і багатай дзяржавай, якой радавацца і ганарыцца будзе беларускі народ нягледзячы дзе ён пражывае або дзе ягоных дзяцей закінуў лёс.

Зь верай у зьдзяйсьненьне ідэй 25 Сакавіка 1918 г., Беларускі Саюз у Рэчы Паспалітай віншуе ўсіх словам-клічам нашай духоўнай еднасьці: Жыве Беларусь!

Старшыня Беларускага саюза ў Рэчы Паспалітай Яўген ВАПА

Зварот кіраўніцтва Згуртавання беларусаў свету „Бацькаўшчына" да суайчыннікаў за мяжой з нагоды 85-й гадавіны БНР

Дарагія суродзічы!

25 сакавіка спаўняецца 85 гадоў з дня абвяшчэння дзяржаўнай незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі. 25 сакавіка 1918 г. Рада БНР, выконваючы волю 1-га Усебеларускага Кангрэса 1917 г. і маючы на гэта ўсе паўнамоцтвы, сваёй Трэцяй устаўной граматай абвясціла Беларусь дэмакратычнай і незалежнай дзяржавай. Ад гэтага часу дзень 25 сакавіка з'яўляецца галоўным нацыянальным святам беларускага народа — Днём Волі, Днём незалежнасці. Утварэнне БНР адкрыла Беларусі шлях у сям'ю вольных і самастойных дзяржаў Еўропы і свету. Урад і Рада БНР за кароткі тэрмін зрабілі значную працу па ўсталяванні дзяржаўных інстытутаў у Беларусі. Вялікія дасягненні былі зроблены ў галіне адукацыі і культуры. Але ў канцы 1918 г. тэрыторыя Беларусі была занята войскамі Савецкай Расіі, і пабудова незалежнай дзяржавы была гвалтоўна спынена. І ўсё ж бальшавікі былі вымушаны лічыцца з імкненнем беларусаў да ўтварэння самастойнай дзяржавы. Таму ў процівагу БНР яны абвясцілі БССР з фіктыўным суверэнітэтам.

Аднак ідэі незалежнасці і справядлівасці не перасталі жыць у нашым народзе. Менавіта Акт 25 Сакавіка стаўся ўзорам пры аднаўленні дзяржаўнасці Беларусі ў 1991 г. Суверэнітэт Беларусі з'яўляецца набыткам не толькі сённяшняга пакалення, але і нашых продкаў і належыць нашчадкам. Суверэнітэт нашай краіны не можа быць абмежаваны або скасаваны ніякімі дзяржаўнымі асобамі і органамі, ці праз рэферэндум. Усебеларускі з'езд за незалежнасць, які адбыўся 19 ліпеня 2000 г., у сваіх рашэннях пацвердзіў усе асноўныя пастулаты БНР і курс на захаванне дзяржаўнага суверэнітэту Беларусі. Пагроза, што навісла над незалежнасцю Беларусі, аб'ядноўвае ўсіх грамадзян краіны, усе палітычныя партыі, якія выступаюць за дзяржаўны суверэнітэт Рэспублікі Беларусь.

У дзень 25 сакавіка беларусы ўсяго свету адзначаюць сваё вялікае свята. **Кіраўніцтва „Бацькаўшчыны" віншуе ўсіх вас і вашыя сем'і, вашых блізкіх з гэтым святам і жадае добрага здароўя, поспехаў у вашай працы на карысць нашай краіны**.

Жыве Беларусь!

Управа МГА ЗБС „Бацькаўшчына"

Свята беларусаў

[1 ☞ працяг]

ні тысяч салдат, якімі Рада БНР не распараджалася, патрэбны былі саюзнікі зацікаўленыя ў існаванні незалежнай Беларусі. Такіх не было ў свеце. Незалежнасць патрабавала таксама волі масаў, мільёнаў людзей і гатоўнасці да ахвяр у абароне сваёй зямлі. Люд тым часам хацеў толькі спакою і хлеба. Беларуская інтэлігенцыя засталася адзінокай. Апрача мараў не мела ніякіх козыраў, каб збудаваць незалежную дзяржаву. У 1920 г. Беларусь падзялілі між сябе бальшавіцкая Расія і Польшча.

Бедны беларускі люд, які хацеў толькі спакойна жыць і працаваць, бальшавіцкія паны гналі спачатку ў калгас, а пасля — у Курапацкі лес. На другім баку мяжы польская шляхта ў паліцэйскіх і чыноўніцкіх уніформах вяртала стан з XVIII стагоддзя. Шмат хто бунтаваўся, але тых называлі камуністамі і пасылалі ў Картуз-Бярозу.

Сёння грамадзянам Беларусі прапануецца адзначаць як нацыянальнае свята 3 ліпеня — дзень уваходу Чырвонай Арміі ў Мінск у 1944 г., дзень паўторнага замацавання савецкай улады ў Беларусі, пачатак новага перыяду русіфікацыі. Адзначаюць яго не толькі ўлады, але таксама мільёны жыхароў краіны. Раней таксама, толькі больш гучна, святкавалі дзень бальшавіцкага перавароту ў Расіі — 7 лістапада. У такіх умовах 25 Сакавіка стала датай, якая ўяўляе ідэйную апазіцыйнасць супраць прыніжэння і лакейства. Гэта свята беларусаў — народа свабодных людзей.

Калі суседнія народы адзначаюць свае святы, у касцёлах і цэрквах гучаць званы, святары моляцца за іх лепшую будучыню. На Беласточчыне за беларускі народ не моляцца ні ў цэрквах, ні ў касцёлах. Малапраўдападобна, што ў Беларусі нехта са святых айцоў, супраць волі чужых епіскапаў, прыпамінае Богу пра існаванне „белорусского племени". Але пакуль у Лондане будзе жыць айцец Аляксандр Надсан, Найвышэйшы кожны дзень пачуе падзяку за ласку ад беларускага народа.

Яўген Мірановіч

Іракская дружба Беларусі

Без перабольшання ўвесь свет назірае за падзеямі вакол Ірака. Гэта натуральна — на карту пастаўленае не толькі дасягненне чарговай перамогі над міжнародным тэрарызмам, але і больш празаічная рэч — цэны на нафту. Супраць вайны выступаюць разнастайныя грамадскія арганізацыі, арганізуючы шматлюдныя маніфестацыі і ставячы пад сумненне неабходнасць прынясення жыццяў ні ў чым не павінных іракцаў у ахвяру барацьбы з Садамам Хусейнам. Ну а лёс апошняга хвалюе значна меншае кола людзей. Чаго і варта было б чакаць — дыктатараў не асабліва шануюць тыя, на каго не распаўсюджваецца дыктатарская ўлада. Але як сведчаць апошнія беларускія знешнепалітычныя стасункі — і ў гэтым правіле ёсць месца выключэнням.

Адносіны паміж Беларуссю і Іракам сталі сур'ёзна абмяркоўвацца з мінулага года. У той час пачаліся надта частыя ўзаемныя візіты прадстаўнікоў розных арганізацый і ўстаноў з канчатковай мэтай умацавання і развіцця двухбаковых стасункаў. Адбывалася гэта на фоне паглыблення крызісу адносін Ірака з большасцю краін свету, у першую чаргу, з-за невыканання ім адмысловых рэзалюцый ААН, што тычыліся, між іншым пазбаўлення зброі масавага знішчэння, а таксама выпраўлення сітуацыі з правамі чалавека.

На жаль, для дыктатарскіх рэжымаў сусветная думка аб тых ці іншых іх дзеяннях прадстаўляе надта малую цікавасць. Але калі дыктатура ёсць чымсьці кшталту добраякаснай ракавай пухліны, гэта значыць не распаўсюджваецца, то цывілізаваны свет глядзіць на яе скрозь пальцы. У выпадку з Садамам усё крыху не так. Час ад часу для праяўлення ваеннага майстэрства перад жабруючым народам яму неабходна распачаць хоць якую-небудзь вайну. Тут дастаткова ўзгадаць войны з Іранам у 80-я гады мінулага стагоддзя і з Кувейтам на пачатку 90-х. І ў тым і ў іншым выпадках асноўнай эканамічнай прычынай баявых дзеянняў паўставала нафта — „чорнае золата". Але як аказалася, стаўленне тых жа ЗША да ваяўнічага Ірака змянялася паводле ўласных інтарэсаў. Калі ў першым выпадку амерыканцы не былі супраць аднаўлення ў Іране свецкай дзяржавы, што знікла пасля вядомай іранскай ісламскай рэвалюцыі, то ў другім — змірыцца з паглынаннем дыктатарскім Іракам прыязнага Захаду Кувейта аказалася для Штатаў немагчымым.

Інспектары ААН ужо доўга шукаюць на падуладнай Хусейну тэрыторыі зброю масавага знішчэння, канчаткова не адказаўшы пакуль на пытанне ці ёсць яна там. У той жа час іранскі пасол у Мінску заявіў, што ў часе вайны 20 гадоў таму іракскі бок такую ўжываў. Ад каго яна да яго трапіла, зважаючы на зацікаўленыя ў той вайне краіны, дакеміць не цяжка.

Такім чынам, узаемаадносіны ЗША з Іракам, як, дарэчы, паміж іншымі краінамі справа інтарэсаў сённяшняга і толькі сённяшняга моманту. Як кажуць англічане — Англія не мае вечных саюзнікаў, Англія мае вечныя інтарэсы.

Аб тым якія інтарэсы абараняе беларускае кіраўніцтва, наладжваючы ўсё больш шчыльныя стасункі з кіраўніцтвам краіны, якая адной нагой у вайне, сказаць не вельмі лёгка. На пачатку сакавіка Мінск наведаў мэр Багдада, які знаёміўся з працай некаторых сталічных прадпрыемстваў, працай сістэмы водазабеспячэння. Канешне ж будзе добра, калі веды аб жыллёва-камунальнай гаспадарцы Беларусі будзе магчыма практычна прымяніць у Багдадзе ў хуткі час. Але, падаецца, галава ў іракскага кіраўніцтва сёння занятая іншым — падрыхтоўкай да вайны. І тут зусім не залішне паклапаціцца аб саюзніках, хаця б такіх далёкіх і ў даным выпадку ўмоўных, як Беларусь.

„Садам прасіў сказаць, што беларускі народ — адзіны народ у Еўропе, які падтрымлівае іракцаў"— заявіў багдадскі госць. Тут можна паспрачацца аб тым, якіх іракцаў падтрымлівае беларускі народ — атачэнцаў Садама, ваюючых супраць яго іракскіх курдаў альбо сотні тысяч іракскіх бежанцаў, што звязваюць сваё вяртанне на радзіму з падзеннем цяперашняга іракскага рэжыму. Але сутнасць не ў тым. Нагоду для такіх слоў багдадскага мэра дае пазіцыя сённяшняга беларускага кіраўніцтва, якое аднойчы сябравала з Мілошавічам супраць амерыканцаў. Здаецца, гісторыя паўтараецца і Беларусь зноў шукае сяброў не для сябе, а супраць кагосьці. Пры тым, што нават Расія не бачыць у падзенні Садама Хусейна асаблівай катастрофы.

Тлумачэннем такіх паводзін афіцыйнага Мінска можа, напэўна, стаць перажытак савецкага антыамерыканізму памножаны на падлеткавую хваробу росту — супрацьпастаўленне сябе ўсяму і ўсім. Бо беларускай незалежнасці, на жаль, усяго толькі 11 гадкоў.

Уладзімір Лапцэвіч

Вельмі Шаноўныя Суродзічы!

Ад імя найстарэйшай і найактыўнейшай арганізацыі беларускіх пасяленцаў у Аўстраліі, я шчыранька вітаю ўсіх Вас з 85-мі Угодкамі Абвяшчэння Незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі Векапомным Актам 25-га Сакавіка 1918 г. Жадаю Вам найлепшага дабрабыту ў будучыні і далейшага замацавання Незалежнасці Рэспублікі Беларусь!

Актам 25-га Сакавіка 1918 г. беларускія патрыёты анулявалі варожыя планы і прэтэнзіі на панаванне ў Беларусі і зрабілі моцную базу для змагання за Святыя Ідэалы нацыянальнай незалежнасці — што і было галоўнай прычынай асягнення сучаснай, сусветна прызнанай дзяржаўнай Незалежнасці Рэспублікі Беларусь!

Вечная Слава Тварцам Акту 25-га Сакавіка!

Няхай Вечна Жыве і Квітнее Незалежная Рэспубліка Беларусь!

Алесь Алехнік, Генеральны Сакратар Беларускай Асацыяцыі Аўстраліі

Латвійскае таварыства беларускай культуры „Сьвітанак" віншуе ўсіх беларусаў Польшчы з найвялікшым беларускім святам — 85 угодкамі абвяшчэння Незалежнай Беларускай Народнай Рэспублікі! З Акту 25 Сакавіка 1918 г. пачалася незалежнасць нашай Беларусі ў XX стагоддзі, зараз, у XXI стагоддзі, мы віншуем усіх з Днём Волі! Няхай жа ЖЫВЕ вольная, прыгожая, заможная, дэмакратычная, сапраўды незалежная наша БЕЛАРУСЬ!

Рада ЛТБК „Сьвітанак"

Фота ЯНКІ ЦЕЛУШЭЦКАГА

Дзяржаўны акадэмічны хор імя Цітовіча з Мінска

Фота ЯНКІ ЦЕЛУШЭЦКАГА

„Дзявочыя ноткі" з Бельска-Падляшскага

Спяванне нясе радасць

[1 ☞ працяг]

Стшалінскі, старшыня Падляшскага ваяводскага сейміка Збігнеў Кшывіцкі, маршалак Падляшскага ваяводства Януш Кшыжэўскі, генеральны консул РБ у Беластоку Леанід Каравайка, падляшскі куратар асветы Зофія Транцыгер-Кочук, кіруючыя беластоцкімі аддзяленнямі Польскага радыё Ежы Мушынскі і Польскага тэлебачання Яцэк Попёлэк ды прадстаўнікі павятовых і гмінных самаўрадавых улад.

Усіх гасцей, выканаўцаў ды публіку прывітаў старшыня Галоўнага праўлення БГКТ Ян Сычэўскі. Павіншаваў ён усе прысутныя прадстаўніцы прыгажэйшага полу з Міжнародным днём жанчын. Прачытаў ліст-пасланне да арганізатараў і ўдзельнікаў гала-канцэрта ад мітрапаліта Варшаўскага і ўсяе Польшчы Савы, які ў сувязі з важнымі душпастырскімі абавязкамі не мог прыехаць.

Фота ЯНКІ ЦЕЛУШЭЦКАГА

Хор Гайнаўскага дома культуры

Старшыня Галоўнага праўлення БГКТ Ян Сычэўскі быў узнагароджаны прэзідэнтам РП Камандорскім крыжам Ордэна адраджэння Польшчы за заслугі ў галіне развіцця і інтэграцыі нацыянальных меншасцей у Польшчы. Затым старшыня камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей Рэспублікі Беларусь Станіслаў Буко ўручыў ганаровыя граматы лепшым калектывам: „Прымакам" з Гарадка, „Крыніцы" і „Каласкам" з Беластока, „Арэшкам" з Арэшкава ды салістцы Ніне Цыванюк з Гарадка.

...І пачаўся юбілейны фестывальны канцэрт. Вялі яго Ева Ласкевіч і Аркадзь Якімюк. Першы выступіў „Расспяваны Гарадок", за ім стараляўкоўскія „Цаглінкі", дуэт Марта Драль і Магдаліна Окулюс і салістка Анна Бабік з Беластока, калектыў „Тырса" з Кляшчэляў, а пасля „Знічка з гайнаўскага белліцэя, „Васілёчкі" з Бельска-Падляшскага ды „Арэшкі" з Арэшкава. Паплылі цудоўныя лірычныя песні пра першае каханне, пра любоў да найдаражэйшай сэрцу роднай старонкі і г.д. Песні сучасныя і фальклорныя. Як у мінулым годзе, так і сёлета прыйшлося „бісаваць" эстрадным калектывам. Вельмі ж даспадобы публіцы былі мелодыі ў выкананні „Лідэра" з Беластока, „Прымакоў" з Гарадка ды „The Best" з Сямятыч. Яны ствараюць асаблівую аўру, стыль. Слухачы ўзнагародзілі іх выступленні доўгімі авацыямі. Спадабаліся песні ў выкананні салістак: Анны Бабік з Беластока, Ніны Цыванюк і Марыі Врублеўскай з Гарадка, Малгажаты Карпюк з Гайнаўкі ды Алы Каменскай з Козлікаў. Яны валодаюць добрым голасам, прыроднай музыкальнасцю. Варта адзначыць, што ўзровень мастацкага выканання песень быў сёлета высокі. На гэта пасадзейнічала таксама моцная канкурэнцыя.

На заканчэнне канцэрта цудоўным спевам заваражыў публіку Дзяржаўны акадэмічны хор імя Г. Цітовіча з Мінска. Як прыгожа спяваў ён песні, між іншым, „Касіў Ясь канюшыну", „Ой зіма, зіма", „Мяцеліца". Усім спадабаліся выступы танцавальнай групы, і прыгожыя ўборы, і краса жанчын з Беларусі. Вельмі ж задорныя, хвацкія былі песні ў выкананні салістак хору. Спеву яны аддалі душу і сэрца. У гонар усяго хору гучалі самыя праніклівыя і шчодрыя авацыі ў зале „Влукняжа".

І так гала-канцэрт наблізіўся да канца. Усе артысты ды публіка стоячы праспявалі песню „Люблю наш край". На тварах удзельнікаў гэтага чатырохгадзіннага культурна-забаўляльнага мерапрыемства была радасць. Яны выходзілі з яго — так мне здалося — нашмат дабрэйшыя адзін да аднаго.

Янка Целушэцкі

Купцы контра супермаркет

Пасяджэнне Рады горада Гайнаўкі, якое адбылося 19 лютага, распачалося ад пытання будовы ў горадзе вялікіх магазінаў. У зале пасяджэнняў Рады і побач будынка гарадскога магістрата сабраліся гайнаўскія купцы і прадпрымальнікі, якія баяцца супермаркетаў.

Радны ад СЛД Ян Вайцюк сказаў, што частка жыхароў горада прыхільна ставіцца да такой інвестыцыі. 14 студзеня адбыўся ў Гайнаўцы неабмежаваны аўкцыён на продаж участка зямлі прадбачанага на будову магазіна. Купцамі сталі інвестары з Варшавы, але пасля пратэсту арганізаванага гайнаўскімі прадпрымальнікамі бурмістр Анатоль Ахрыцюк адмяніў рашэнне аўкцыёну. Затым пасля спаткання з варшаўскімі інвестарамі абяцаў на працягу двух тыдняў паўторна разгледзець справу продажу зямлі і будовы магазіна.

Радныя патрабавалі вызначыць палітыку развіцця паслуг у горадзе і прапанавалі, каб рэвізійная камісія спраўдзіла, ці бурмістр правільна прадаваў гарадскі ўчастак пад будову маркета. На разгляд быў прадстаўлены праект гарадской пастановы, якая забараняла б будову ў горадзе магазінаў з гандлёвай плошчай большай за 400 квадратных метраў. Праект падрыхтаваны быў пасля пратэстаў гайнаўскіх купцоў і разглядаўся на пасяджэннях трох камісій. Сабраныя на сесіі купцы падтрымлівалі прапанаваную пастанову. Паводле іх маркет спрычыніцца да банкруцтва малых магазінаў і росту беспрацоўя. Прыхільнікі вялікага магазіна тлумачылі, што цэны на прадукты будуць у ім ніжэйшымі за прапанаваныя ў малых магазінах. Многія жыхары Гайнаўкі робяць пакупкі ў беластоцкіх супермаркетах.

Бурмістр паінфармаваў, што за прададзеную варшаўскім прадпрымальнікам зямлю горад можа атрымаць 600 тысяч злотых, 200 тысяч злотых інвестары хочуць перадаць на гарадскія інвестыцыі і кожны год у гарадскую касу паступаць будуць 72 тыс. зл. падаткаў. Выступленне бурмістра не пераканала прыхільнікаў малых магазінаў. 18 радных прагаласавалі за забарону будовы ў горадзе магазінаў з гандлёвай плошчай большай за 400 кв. м, а толькі двое радных устрымаліся ад галасавання. Гэтае рашэнне з радасцю ўспрынялі гайнаўскія прадпрымальнікі. Многія думалі, што яно закончыла спрэчку вакол будовы маркета.

Купцы паўторна пачалі пратэставаць супраць будовы маркета 3 сакавіка. У гэты дзень бурмістр Анатоль Ахрыцюк падпісаў натарыяльную дамову з варшаўскімі прадпрымальнікамі аб продажы ўчастка пад будову вялікага магазіна. Новапрынятая пастанова не мае папярэдняй сілы і не можа адмяніць ранейшага продажу зямлі ў час аўкцыёну. Бурмістр тлумачыў сабраным у яго кабінеце купцам, што нельга законна адмяніць вынікі аўкцыёну пасля абвяшчэння яго вынікаў. Заступаўся ён за кліентаў, якія павінны мець права на свабодны выбар месца пакупак. Старшыня ПСС „Сполэм" Мечыслава Багдановіч сказала, што будзе бараніць месцы працы ў яе гандлёвым прадпрыемстве. Купцы хочуць, каб пракуратура праверыла ці продаж зямлі пад будову магазіна быў праведзены законна.

Аляксей Мароз

Грамадска-дэмаграфічнае становішча Арлянскай гміны

Назіраючы змены ліку насельніцтва ў Арлянскай гміне можна заўважыць, што лік яе жыхароў значна паменшаў у 1970-1980 гг. У перыяд 1981-1990 гг. спад ліку насельніцтва запаволіўся, каб паскорыцца ў наступным дзесяцігоддзі. У 1970 годзе гміна налічвала 7 020 асоб, у 1991 — 5 018, а ў палове мінулага года 3 760 чалавек.

Шчыльнасць насельніцтва Арлянскай гміны ў параўнанні з іншымі вясковымі гмінамі Бельшчыны сярэдняя — 24 асобы на квадратны кіламетр. Затое найбольшы ў павеце паказчык фемінізацыі насельніцтва — тут 108 жанчын на 100 мужчын; гэты паказчык намнога вышэйшы і за сярэдні для вясковай тэрыторыі Падляшскага ваяводства — толькі 97 на 100.

Лік насельніцтва ў гміне сістэматычна падае. Розніца паміж колькасцю нараджэнняў і сконаў з'яўляецца значным адмоўным лікам, меншым чым у іншых вясковых гмінах павета і ваяводства. У вышэйзгаданых гадах у абсалютных ліках была яна роўная -40, -56 і -43, а ў пераліку на тысячу жыхароў -10, -14,4 і -11,3.

Міграцыя насельніцтва ў 1999-2001 гадах (апрача 2000 года) паказвала адмоўнае сальда. У той час з Арлянскай гміны выпісалася 81 асоба ў 1999 годзе, 51 у 2000 і 60 у 2001 годзе. Гэтае сальда падае, што можа паказваць на стабілізацыю насельніцтва.

Міхал Мінцэвіч

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Гімназісты працавалі 1,5 гадзіны

Гімназічны конкурс па беларускай мове

У Комплексе школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы 10 сакавіка адбыліся ваяводскія элімінацыі Прадметнага гімназічнага конкурсу па беларускай мове. Прынялі ў ім удзел 11 фіналістаў.

Вучням трэба было пісьмова пераказаць змест фрагмента твора Якуба Коласа „На ростанях" і даць загаловак сваёй працы. Гімназісты параўноўвалі лесніковую пасаду з панскай хатай, карыстаючыся фрагментамі паэмы Якуба Коласа „Новая зямля". З тэкстаў вучні выпісвалі фразеалагізмы, сінонімы і супрацьлеглыя рысы.

— У час ваяводскіх элімінацый вучні многа працавалі з тэкстамі, — заяўляе старшыня конкурснай камісіі Міраслава Маркевіч. — Гэта развівае ўмеласці вучняў.

Гімназісты апасаліся зрабіць памылкі ў пераказе зместу прыродаапісальнага фрагмента або ў параўнанні тэкстаў з „Новай зямлі". Аказалася, што працы вучняў былі вельмі добрымі. Наталля Кучынская і Бэата Хіліманюк з Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Бельску-Падляшскім набралі максімальную колькасць балаў (па 50). Лаўрэатамі сталі таксама Юстына Вышкоўская з Ягуштова, Анна Скавародка з Дубіч-Царкоўных, Анна Патопец з Нараўкі, Эвеліна Пліс з Чыжоў, Веслаў Лукашук, Марта Добаш і Анна Манцюк з Бельска-Падляшскага. Некаторыя з ліку лаўрэатаў перамаглі ў мінулым годзе. Двух вучняў з бельскай „тройкі" набралі менш чым 45 балаў і сталі фіналістамі. Лаўрэаты і фіналісты атрымаюць дадатковыя балы ў час рэкрутацыі ў сярэднюю школу.

Аляксей Мароз

Беспакаранасць

Калі б не быў я грамадзянінам Польшчы і з польскім народам нічога супольнага не меў, дык для свайго спакою не чапаў бы праблемы, з якой салідарызуюся з іншымі грамадзянамі нашай краіны, а асабліва з былымі ваякамі, якія ад сённяшніх улад дазналі крыўды, аб якой не думае прэзідэнт „усіх" палякаў і прэм'ер. Але як паўнапраўны грамадзянін я маю такое права і маўчаць не буду!

У маёй айчыне, вываяванай з вялікімі цяжкасцямі і морам крыві, каб быць еўрапейцам на поўны рост, аказалася, што найвялікшай пагрозай з'яўляецца беспакаранасць амаль у кожнай галіне жыцця, у кожным асяроддзі ўлады: заканадаўчай, у суполках, дзяржаўных установах ды прадпрыемствах.

Як можа сябе адчуваць грамадзянін Польшчы, калі імунітэт ахоўвае парламентарыяў перад адказнасцю за язду выпіўшым? Фармаваць правільныя паставы людзей можна толькі ў асяроддзі недэмаралізаваным, не піяцкім, але цвярозым, асабістым прыкладам. А дэпутаты, якія ўстанаўляюць законы, самі іх парушаюць. Гэта святыя каровы, якія выраслі у нашым, на 95% каталіцкім краі. Многія дэпутаты, тыя менш фальшывыя, гавораць проста, што „імунітэт — гэта анахранізм". Недатыкальнасць бароніць злачынцаў, якія пхаюць грошы ў выбарчую кампанію, каб пазбегчы крымінальнай адказнасці.

Як зразумець сітуацыю, калі сябра парламента хаваецца ў выпадку злачынства за імунітэт! Злачынца з імунітэтам ведае, што ягоныя калегі ў парламенце не дазволяць яго пакрыўдзіць. Гэта ж невыбачальная няроўнасць перад законам.

Здаецца, што беспакаранасць давяла кар'ерыстаў і злачынцаў да такога нахабства, якое пагражае Польшчы развалам. Па сённяшні дзень дэпутаты не прынялі закона аб канфіскацыі ўкрадзенага маёнтку злачынцам да трэцяга пакалення. Таму, між іншым, існуюць і хутка развіваюцца крадзяжы, прысвойванне агромных сум нашых (падаткаплацельшчыкаў) грошай. У беспакаранасці няма ніякай адказнасці, можна красці ўсё і ўва ўсіх, бо ніхто не будзе выкліканы, ці за шыварат прыведзены ў суд. Агромных фінансавых злоўжыванняў на нашых вачах дапускаюцца некаторыя ўладальнікі імунітэтаў (дэпутаты Сейма, суддзі, пракуроры, паліцыянты). Нават калі злодзею мільёнаў еўра, долараў, злотых і т.п. віна даказана, то канфіскаты няма нават усімі бачаных вілаў. Значыцца, грабеж Польшчы аплачваецца. Проста, раз'юшанасць злачынцаў не мае межаў.

Польскія мафіі завуцца арганізаванай злачыннасцю, бо ж у Польшчы мафіі быць не можа. А гэта абазначае больш-менш тое, што Польшча апынулася ў кіпцюрах мафіі, з якою ўрад не можа справіцца, робячы з сябе пасмешышча. Выкупы, якія злачынцам вымушаны плаціць уладальнікі магазінаў, кавярняў, гатэляў, дыскатэк і т.п. пад пагрозай смерці ў выніку адмовы, састаўляюць мільярды злотых. Намінацыя ўсё больш паліцыйных генералаў, як каштоўнае лякарства на беспакаранасць, падвяло цалкам і асмешыла паліцыйную вярхушку.

Усё часцей злачынцы займаюць важнейшыя пасты, бо яны пад маскай дабрадзеяў, абкрадаюць наіўных выбаршчыкаў, каб іх коштам разбагацець. Няма ніякіх крытэрыяў, каб тым людзям не даць магчымасці займаць адказныя дзяржаўныя пасты. Чаму гэтых людзей не пытаюць, ці былі пакаранымі, не паказваюць іх у судах і не называюць прозвішчаў у сродках масавай інфармацыі? Сёння гангстэры першыя страляюць і забіваюць, а ўся дзяржаўная ўлада і няўрадавыя арганізацыі вельмі дбаюць пра тое, каб злачынцаў ніхто не пазнаў і не пакрыўдзіў.

Дзе мы жывем!

Васіль Петручук

Вачыма паляка

І я ў справе Рывінгейт!

Старанна пазбягаў я пісаць аб г.зв. афёры Рывіна, бо і так не мог у гэтай справе сцвердзіць больш, чым гаворыцца перад следчай камісіяй, на розных прэс-канферэнцыях ці ў каментарах варшаўскіх назіральнікаў. Гляджу паказанні цэлымі днямі. Перабягаю пультам па ўсіх тэлестанцыях і з палаючымі шчокамі сачу за думкамі, якія там выказваюцца. Урэшце стаў я выдаваць апошнія заначкі на агульнапольскую і мясцовую прэсу, каб на ўсласныя вочы ўпэўніцца ў тым, што сам дадумаўся ці гэту сваю думку сканфрантаваць. А пра *Rywingate* выказваюцца ўсе медыі. Нават часопіс, які падкінуў мне Вандал Арлянскі, месячнік „Wróżka", які піша пра прадказанні і які публікуе верагодныя гараскопы, у апошні час змясціў „гітавы" тэкст прысвечаны Льву Рывіну. І што з яго вынікае? Ну, што „зоркі яму заўсёды спрыялі", „ніколі не даведаемся ад яго праўды", „ад верасня павінен панесціся на хвалі лёсу", потым „абтрасе пёркі і далей будзе круціць свае інтарэсы", каб пасля 2009 г. „урэшце пачаць духова прагрэсаваць". А што цікава можа быць для чытача „Нівы"? Гэты вядомы ў свеце фільмавы прадзюсер нарадзіўся ў Беларусі, хоць гэта не мае ніякага дачынення да спробы атрымання хабару. Гэтыя прадказанні, хоць адных могуць рассмяшаць, іншых узлаваць з-за скрываных за імі намёкамі, у большасці нічым не адрозніваюцца ад іншых масавых спекуляцый, якія выказваюцца на калонках г.зв. сур'ёзнай агульнапольскай, ды і лакальнай прэсы, і ў электронных медыях.

* * *

Аб справе Рывіна ахвотна выказваюцца таксама мясцовыя журналісты. У большасці, аднак, спрабуюць яны адносіцца да таго, што пачулі ў паказаннях перад следчай камісіяй. Час ад часу, аднак, я не магу зразумець цяжар ацэнак прадстаўленых некаторымі з іх. Так у апошні час было з каментарам галоўнага рэдактара правай „Вспулчэснай газеты" Конрада Крушэўскага аб „Тыдні ў аб'ектыве", перадачы беластоцкага тэлецэнтра кіраванага дырэктарам блізка звязаным з найвышэйшымі элітамі СЛД. Рэдактар Крушэўскі папракаў следчую камісію ў тым, што яе нарады зацягваюцца да 16 гадзіны, бо, як адназначна намякаў, дэпутаты спяшаюцца на абед. Яго здзіўляў факт, што паказанні не адбываюцца кожны дзень. Кожны ўважлівы назіральнік ведае, што паказанні дастасоўваюцца да эфірнага часу публічнага тэлебачання (рэгіянальнага) і бяруць пад увагу „стомленасць" дэпутацкага „матэрыялу" шматгадзіннымі роспытамі на працягу кожнага дня. Тыднёвыя паўзы звязаны з пленарнымі пасяджэннямі Сейма, у якіх маюць абавязак удзельнічаць дэпутаты са следчай камісіі. Ну, але ж кожны журналіст у Польшчы, асабліва займаючы ў рэдакцыі нейкую функцыю, адчувае сябе ў абавязку выказацца ў нейкі спосаб аб рывінскай справе.

* * *

А, можа, і я паспекулюю, папытаюся? А чаму ж бы і не? Урэшце ж, два гады працаваў я ў TVP, пасля сем у „Выбарчай", бываў на банкетах, раз таксама на прыёме ў Французскім пасольстве, як і прэзас TVP-сведка Роберт Квяткоўскі ды падазроны Леў Рывін, хвіліну пасля канфрантацыі, і прэм'ер Лешак Мілер. Толькі што я на банкет у амбасадзе трапіў з 9 гадоў да гэтай канфрантацыі. Ну, вось. Калі пішу гэты тэкст, здзіўляе мяне, што ніхто з беластоцкіх журналістаў не „распрастаў крылля" на пасрэдна звязаную з афёрай тэму — удзел у працах над папраўкамі зкона аб радыёвяшчанні падляшскай дэпутаткі СЛД (былой журналісткі Беластоцкага тэлебачання, а яшчэ раней Радыё Беласток) Барбары Цірук, сяброўкі сеймавай камісіі культуры і сродкаў масавай інфармацыі. Успомніла аб ёй намесніца галоўнага рэдактара „Выбарчай газеты" Галена Лучыва і ў апошні час старшыня Краёвай рады радыёвяшчання і тэлебачання (КРРіТ) Юльюш Браўн. Старшыня Браўн нават сцвердзіў, што дэпутатка Цірук кансультавала свае працы над дэканцэнтрацыйнымі папраўкамі (справа, здаецца, у блакіраванні „Агоры", выдаўцу „Выбарчай", доступу да тэлевізійнага рынку) з сакратаром КРРіТ Владзімежам Чажастым, адным з падазроных ва ўмяшанні ў справу.

Іншы цікавы мясцовы матыў, выкліканы дапытванымі і працягваны пасля членамі камісіі, гэта справа Згуртавання Ардынацкая, арганізаванага В. Чажастым, у склад якога ўваходзяць былыя сябры Згуртавання польскіх студэнтаў, сёння, як намякала прэзас „Агоры" Ванда Рапачынская, ствараючыя нефармальныя, кампаніі ўзаемнай падтрымкі на розных адказных вярхушках. У гэтай гронцы апынуўся і Анатоль Вакулюк, блізкі супрацоўнік Владзімежа Цімашэвіча, шэф Наглядальнай рады Радыё Беласток, віцэ-старшыня падляшскага СЛД, дырэктар беластоцкага філіяла аднаго з банкаў. Іншая „прамінентная" асоба са Згуртавання Ардынацкая гэта Галіна Руткоўская, сёння генеральны дырэктар Падляшскай ваяводскай управы ў Беластоку (ад яе залежаць персанальныя ператасоўкі ва ўстанове). Ці хтосьці пытаўся, што яны могуць сказаць аб справе тусоўкі людзей з Ардынацкай? Ці хтосьці з мясцовых журналістаў спрабаваў прыціснуць дэпутатку Цірук на тэму закона аб радыёвяшчанні і тэлебачанні?

* * *

Ужо пасля таго, як гэты тэкст быў здадзены ў друк, справіўся са справай беластоцкі „Кур'ер Паранны" і распытаў дэпутатку Барбару Цірук. І дадаю пару сказаў. На пытанне журналіста „Параннага", якое датычыла папраўак да закону, дэпутатка Цірук адказвае: „Калі гэты запіс я мела гатовы ў якіхсьці 80 працэнтах, скансультавала яго з Валодзем Чажастым, бо ж яго ведаю шмат гадоў і мы з ім на «ты»". Пакіну гэта без каментара. Дадам толькі, што і я з паняй дэпутаткай на „ты", а са мною гэтай папраўкі не кансультавала. Ну, але ж я не прэзідэнцкі член КРРіТ, як, па словах пані дэпутаткі, Валодзя Чажасты, які, нягледзячы на заклік прэзідэнта Кваснеўскага, не збіраецца ў адстаўку.

Мацей Халадоўскі

Ахова правоў нацыянальных і этнічных меншасцей у краінах Еўрасаюза

Гісторыя фарміравання Еўрасаюза пачалася ў 1949 годзе. Разам з узнікненнем заходнееўрапейскіх гаспадарчых і палітычных структур фарміравалася таксама супольнае заканадаўства аб ахове правоў чалавека ва ўсіх членскіх краінах. У лістападзе 1950 г. Камітэт Савета Міністраў Еўропы выдаў дакумент пад назвай *Канвенцыі аб ахове правоў чалавека і асноўных свабод*. Дакумент успрымаўся як абсалютны мінімум, які гарантавалі краіны заходняй Еўропы сваім грамадзянам. Яго змест засяроджваўся на ахове правоў адзінкі, якая мела сама вырашаць: якой хоча быць нацыянальнасці, якую мову лічыць сваёй, якім багам маліцца. Абмежаванне гэтых правоў кім-небудзь абазначала парушэнне існуючага заканадаўства.

Гэты мінімум пачаў пашырацца разам з тэмпамі еўрапейскай інтэграцыі. Філасофія яднання будавалася на перакананні, што без стварэння універсальных правоў грамадзянам паасобных краін немагчыма дасягнуць палітычнага паразумення паміж дзяржавамі. Немцы ў Эльзасе, напрыклад, не павінны адчуваць сябе горш чым іх суродзічы ў Нямеччыне. Раней адчужэнне меншасцей выкарыстоўвалася суседнімі краінамі, было прычынай вялікіх еўрапейскіх канфліктаў. Таму новыя еўрапейскія пастановы, як *Дакумент сустрэчы Капенгагенскай канферэнцыі* з чэрвеня 1990 г., *Парыжская хартыя новай Еўропы* з лістапада 1990 г., *Рапарт Жэнеўскай сустрэчы экспертаў АБСЕ* з ліпеня 1991 г., а асабліва *Рамачная канвенцыя аб ахове нацыянальных меншасцей* з лістапада 1994 г. накладалі на еўрапейскія дзяржавы абавязак ствараць умовы для падтрымкі тоеснасці, мовы, культуры, традыцыі і веравызнання нацыянальных меншасцей. Змест артыкула 5 *Рамачнай канвецыі* быў формай забавязання падпісваючай яго краіны стрымоўвацца ад якой-небудзь дзейнасці, якая магла б паспрыяць асіміляцыі нацыянальных меншасцей.

Кожны з прадстаўленых дакументаў падымаў планку абавязваючага мінімуму на вышэйшы ўзровень. Некалькі гадоў у краінах Еўрасаюза ішла дыскусія над тым, якія маюць быць канчатковыя правы нацыянальных мешасцей. Высновы з гэтай дыскусіі такія, што ў справе аховы правоў чалавека не можа быць завяршальнага моманту. Гэта працэс няспынны і разам з узніканнем новых праблемаў трэба іх вырашаць дарогай пошуку кампрамісаў.

Супольнай прыкметай еўрасаюзнага заканадаўства — імкненне да захавання роўнасці ўсіх грамадзян і забароны якой-небудзь дыскрымінацыі. Дыскрымінаваць забаронена не толькі органам дзяржаўнай ці самаўрадавай адміністрацыі, але таксама фізічным асобам і грамадскім арганізацыям. Дзяржава мае абавязак змагацца з такімі практыкамі пры дапамозе ўсіх юрыдычных і адміністрацыйных сродкаў. Публічнае антыбеларускае выказванне пасла і дзеяча адной з шавіністычных груповак з Беластока, якое было прадметам каментараў у лакальнай прэсе, у еўрасаюзнай краіне выклікала б рэакцыю пракурора.

Свабода выбару прыналежнасці да нацыянальнай меншасці ў краінах Еўрасаюза не абазначае, што прадметам аховы ёсць меншасць як група. Правы мае толькі адзінка, якая з'яўляецца членам нацыянальнай супольнасці. Дзяржава мае абавязак гарантаваць адзінцы ўмовы для захавання свае культуры, мовы, традыцыі і развіцця тоеснасці.

Адной з нявырашаных праблем у Еўрасаюзе з'яўляецца справа карыстання роднай мовай. Няма сумненняў наконт права на яе вывучэнне ці карыстанне ў прыватных кантактах. Меншасці маюць магчымасць пісаць свае імёны і прозвішчы паводле прынцыпаў роднай мовы. Зразумела, усё гэтае магчымае тады, калі французскі Жан, пражываючы ў Нямеччыне, не захоча звацца Гансам. Ён сам, асабіста, можа вырашыць справу свайго імя, але не можа яму гэтага накінуць ніякае прадстаўніцтва французскай нацыянальнай меншасці ў Нямеччыне. Яшчэ цяжэй вырашыць такія праблемы як карыстанне роднай мовай меншасці ў кантактах з чыноўнікамі краіны, якія тае мовы, па аб'ектыўных прычынах, не ведаюць. Вялікія эмоцыі выклікала ў свой час справа надпісаў на роднай мове меншасцей, асабліва ў тых памежных раёнах, якія ў мінулых стагоддзях былі прадметам канфліктаў паміж народамі, ці дзяржавамі — памежжа аўстрыйска-італьянскае, французска-нямецкае, нямецка-дацкае. Працэс пошукаў кампрамісаў у гэтай справе набліжаў да двухмоўных надпісаў назваў мясцовасцей і ўсіх геаграфічных назваў. На прыватных будынках, школах, культурных установах мову надпісаў вызначае ўласнік.

Права на навуку на роднай мове з'яўляецца адным з галоўных правоў нацыянальных меншасцей у Еўрасаюзе. Ад дзесяткаў гадоў дамінуе там перакананне, што найбольш паспяхова асіміляцыя праходзіць праз школу нацыянальнай большасці. Таму заходнееўрапейскае заканадаўства гарантуе перш за ўсё доступ нацыянальным меншасцям да адукацыі на роднай мове. Дзяржаўная мова часта вывучаецца як другая.

Не менш важнае права гарантаванае дзяржавай маюць заходнееўрапейскія меншасці ў галіне доступу да інфармацыі. Ідзе аднак не пра 15 хвілін кожнага дня ў лакальным радыёвяшчанні ці 20 мінут у тыдзень у лакальным тэлебачанні на роднай мове. Заходнееўрапейскае заканадаўства зыходзіць з такога пункту гледжання, што так як большасць мае пастаянны доступ да эфірнага часу на сваёй мове, так меншасць у гэтай справе не можа быць дыскрымінаванай. Інфармацыйная сістэма для меншасцей прадбачвае таксама магчымасці інфармавання пра сябе большасці. Сродкі масавай інфармацыі павінны ствараць магчымасць двухбаковага кантакту на аднолькавых правах. У Беластоку гэта можа гучаць як фантазія.

Вельмі важным правам гарантаваным заканадаўствам ёсць магчымасць удзельніцтва ў палітычным і грамадскім жыцці. Аблягчаецца меншасцям доступ да заканадаўчых і адміністрацыйных органаў улады. Ніводзін орган дзяржаўнай улады не можа прымаць рашэнняў у справе меншасцей без паразумення з імі. У нас вызначаюць упаўнамочанага ваяводы „do obserwacji mniejszości", быццам недастаткова назіранняў з боку спецслужбаў.

Нормай з'яўляецца магчымасць кантактаў з суродзічамі, пражываючымі за мяжой і карыстання дапамогай з боку суседняй дзяржавы. Усё гэта даволі простае ва ўмовах палітычнай інтэграцыі і добрых суседскіх адносін паміж заходнееўрапейскімі краінамі. Такая ахова правоў меншасцей з'яўляецца вынікам дзесяцігоддзяў пошукаў грамадскага-палітычнага парадку карыснага перш за ўсё для пераважнай большасці грамадства — так меншасцей, як і большасці. Але перш за ўсё павінна быць воля з боку дамінуючай нацыі дазволіць меншасцям мець тое, што мае большасць. Дзеля гэтага патрэбная іншая якасць палітычнай культуры грамадства, чым тая, якую можам назіраць на Беласточчыне.

Яўген Мірановіч

У Еўропе аднолькавых шанцаў

З гэтага нумара пачынаем рэалізацыю праекта „У Еўропе аднолькавых шанцаў". У яго рамках надрукуем цыкл з 12 артыкулаў, прысвечаных нацыянальным меншасцям у краінах Еўрапейскага Саюза і Польшчы. У артыкулах прадстаўлена будзе еўрапейскае заканадаўства ў галіне падтрымкі нацыянальных меншасцей і практычнае яго выкананне на прыкладзе баскаў у Іспаніі і Францыі, кельтаў у Шатландыі, фінаў у Швецыі, сербаў-лужычан і датчан у Нямеччыне, славенцаў у Аўстрыі і беларусаў у Польшчы. Да кожнага артыкула прыкладзена будзе конкурснае пытанне. Аўтары правільных адказаў возьмуць удзел у штотыднёвай жарабёўцы трох кніжных узнагарод, а на канец галоўнага прызу — набору дапаможнікаў для вывучэння англійскай мовы. Спонсарам праекта з'яўляецца Управа Камітэта еўрапейскай інтэграцыі.

1 конкурснае пытанне

Да чаго забавязвае еўрапейскія дзяржавы артыкул 5 *Рамачнай канвенцыі аб ахове нацыянальных меншасцей* з лістапада 1994 года?

Адказ: .....

.....

.....

.....

.....

.....

.....

.....

Імя і прозвішча: .....

Адрас: .....

(Каб правільна адказаць на пытанне трэба ўважліва прачытаць надрукаваны побач артыкул. Адказы просім дасылаць на гэтым талоне на адрас рэдакцыі. Тэрмін дасылання адказаў — да 30 сакавіка 2003 г.)

Вучні і Еўрапейскі Саюз

У рэферэндумах, арганізаваных у гімназіях і сярэдніх школах Гайнаўскага і Бельскага паветаў, большасць вучняў выказалася за ўступленне Польшчы ў Еўрасаюз. Аднак перавага прыхільнікаў інтэграцыі з еўрапейскімі краінамі была невялікай. У Ягуштоўскай і Чыжоўскай гімназіях і Комплексе лясных школ у Белавежы большасць вучняў былі супраць ідэі яднання з еўрапейскімі дзяржавамі.

У Комплексе школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Бельску-Падляшскім 58,1% гімназістаў галасавалі за ўступленне Польшчы ў Еўрасаюз, 22,2% вучняў былі супраць, а апошнія не мелі погляду на гэтую тэму. У Бельскім белліцэі 60% вучняў былі за інтэграцыю, а 31,3% супраць.

— Я прагаласавала за Еўрасаюз, бо ў нас вялікае беспрацоўе, а ў еўрапейскіх краінах можна будзе лягчэй знайсці працу, — заяўляе Марта Добаш з Бельскай белгімназіі. — Праўду кажучы, я не аналізавала за і супраць, але галасавала крыху эмацыйна.

— Я многа не ведаю аб Еўрасаюзе, але галасавала за ўступленне ў яго. Можа пасля інтэграцыі з еўрапейскімі дзяржавамі будзе лепш жыць у нашай краіне. Трэба паспрабаваць новага, — кажа Наталля Кучынская з Бельскай белгімназіі.

— Падкрэсліў я ў час рэферэндуму, што не выпрацаваў сваіх поглядаў у справе ўступлення ў Еўрасаюз. Аб будучай інтэграцыі з еўрапейскімі краінамі гаварылі мы на ўроках геаграфіі, многа чулі па тэлебачанні. Аднак гэтага замала, каб рашыцца, — гаворыць Адрыян Федарук з Гімназіі з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Бельску-Падляшскім.

У Гайнаўскім комплексе школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы было менш чым у Бельску-Падляшскім прыхільнікаў Еўрасаюза. У белгімназіі за інтэграцыю прагаласавалі 57,9% вучняў, а супраць — 35,9%. У белліцэі за далучэнне да еўрапейскіх краін галасавалі 50%, а супраць — 44,5% вучняў.

— У час рэферэндуму мы абазначылі, што не выпрацавалі сваіх поглядаў на тэму ўступлення ў Еўрасаюз. Аб прадбачванай інтэграцыі з еўрапейскімі краінамі гаварылі мы на ўроках геаграфіі, гісторыі, слухалі аб гэтым па радыё і тэлебачанні. Аднак гэтых інфармацый было мала, каб рашацца. Мы апасаемся, што чужаземцы могуць пачаць купляць нашую зямлю, а людзі, якія будуць прыязджаць з-за мяжы, будуць ствараць канкурэнцыю на рынку працы, — заяўляюць Агнешка Занкевіч і Наталля Шляхцюк.

— Галасавала я супраць уступлення ў Еўрасаюз, бо апасаюся за нашую гаспадарку, якая не з'яўляецца стабільнай. Мы ахвотна купляем замежную касметыку, вопратку і польскі рынак не будзе мог абараніцца ад прадуктаў з Захаду. У такім выпадку можа павялічыцца беспрацоўе, — кажа вучаніца IV „б" класа Гайнаўскага белліцэя.

У школах распаложаных па-за Гайнаўкай і Бельскам-Падляшскім яшчэ менш было прыхільнікаў інтэграцыі Польшчы з іншымі краінамі. У Арлянскай гімназіі за ўступленне ў Еўрасаюз галасавалі 51,4% вучняў, а супраць былі 37,5% гімназістаў. У Комплексе лясных школ у Белавежы толькі 36,8% вучняў галасавалі за інтэграцыю з Еўрасаюзам, а 55% вучняў былі супраць. У Чыжоўскай гімназіі 40,6% вучняў былі за Еўрасаюзам, а 43,5% супраць. Сярод школ, дзе вядзецца навучанне беларускай мове найбольш вучняў галасавалі супраць уступлення ў Еўрасаюз у Ягуштоўскай гімназіі (68,4%) і толькі 25,4% гімназістаў падтрымалі там ідэю ўступлення ў Еўрасаюз. Выключэннем стала Дубінская гімназія, дзе 73,4% вучняў галасавалі за ўступленне ў Еўрасаюз і толькі 11,2% супраць.

— Я была супраць уступлення ў Еўрасаюз. Не думаю, каб на вёсцы стала лепш пасля яднання з еўрапейскімі краінамі. У Ягуштове большасць гаспадароў супраць уступлення ў Еўрасаюз. Кажуць, што для маладых будзе праца ў еўрапейскіх краінах, але цяжка будзе пакінуць сямейнікаў і ехаць за хлебам у іншыя дзяржавы. Кожны хоча жыць на бацькаўшчыне, — заяўляе Юстына Вышкоўская з Ягуштоўскай гімназіі.

Аляксей Мароз

Зорка
старонка для дзяцей

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

„Роднае слова” ў Нарве

На гмінны дэкламатарскі агляд Нарваўскі дом культуры запрасіў вучняў з пачатковых школ у Ласінцы і Нарве ды нарваўскіх гімназістаў. Пасля школьнага адбору да конкурсу закваліфікавалі 39 асоб, а 30 прыехалі ці прыйшлі 6 сакавіка выказацца на роднай мове ў паэзіі і прозе. Камісія — Міра Лукша, Валянціна Базылюк і Ала Сяткоўская — павінна была справядліва справіцца з ацэнкай вельмі старанліва падрыхтаваных дэкламатараў. У гэты раз, як адзначылі настаўніцы, была вельмі цікавая падборка матэрыялу — скарысталі былі зборнік твораў для дзяцей, падрыхтаваны Алінай Ваўранюк „Кругагод”, дык вельмі рэдка паўтараліся вершы, якія дэкламавалі вучні. Праўда, выбар не залежаў таксама ад іх саміх, хоць, вядома, калі верш спадабаўся дэкламатару, дык і выкананне было больш пераканаўчым. Відаць, даспадобы, напрыклад, былі вершы „Бусел і хопчык” Авяр’яна Дзеружынскага ды „Каляровыя алоўкі” Петруся Макаля. Прагучалі таксама творы класіка Якуба Коласа, сатырыка Эдуарда Валасевіча, аднаго з самых папулярных аўтараў для дзяцей Станіслава Шушкевіча, Васіля Хомчанкі, пішучых і сёння Уладзіміра Ягоўдзіка, Алеся Каско, Сяргея Панізніка, Расціслава Бензярука, Кастуся Жука, і тутэйшых — Міколы Гайдука, Віктара Шведа... Дарэчы, для дзяцей неістотна, ці аўтар жывы — вершы для дзяцей несмяротныя, на іх вучацца пакаленні...

У групе вучняў ад 0 да III класаў на I месцы апынуўся Кшысь Грынявіцкі, на II — Дамініка Юшкевіч, на III — Лукаш Пляскавіч. Вылучаны былі Юстына Банькоўская, Юліта Клімюк і Юліта Кананюк. А сярод дэкламатараў з IV-VI класаў на першае месца паставілі Магду Дудзіч, на II — Аліцыю Міранчук, на III — Улю Рашкоўскую. Вылучылі — Юстыну Асіпюк і Аню Пашко. Сярод гімназістаў (гімназістак!) найлепш выступілі Эва Русіновіч і Аня Іванюк (II месца) ды Іаанна Стоцкая (III), вылучаны былі Юстына Ракоўская і Моніка Банькоўская. Вядома, вопытная камісія звяртала ўвагу найперш на якаснасць выканання — мастацкасць, вобразнасць, але і на маўленне. А найчысцей, найакуратней выступіла, хоць прастуджаная, Эва Русіновіч, якая захапіла, між іншым, цудоўным вымаўленнем „л” і ўсіх іншых гукаў!

(лук)

Змагаліся і інтэграваліся

Брацтва праваслаўнай моладзі кожны год арганізуе спартыўныя спаборніцтвы па футболе, баскетболе і гонках. Сёлетні турнір моладзь арганізавала ў Комплексе школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы. Спаборніцтвы, якія праходзілі 22-23 лютага г.г. былі магчымыя дзякуючы ангажаванасці моладзі Гайнаўскага брацтва і добрай волі дырэктара ліцэя Яўгена Сачко.

Турнір пачаўся каля 10 гадзіны. Зацікаўленне гульнямі было вялікае, як з боку спартсменаў, так і публікі, якая гучна садзейнічала гульні. З’явілася 16 каманд з Гайнаўкі, Нарвы, Нараўкі, Беластока, Ласінкі, Дубін і Белавежы.

Тры каманды з Гайнаўкі, дзве з Нараўкі, адна з Беластока, Нарвы і Дубін вылучыліся ўмеласцямі, усе перайшлі ў другі этап, які адбыўся ў нядзелю 23 лютага. Матчы моцна ўсіх хвалявалі, а самую вялікую ўвагу прыцягнула спаборніцтва паміж Гайнаўкай „I” і Нараўкай ды Гайнаўкай „IV” і Дубінамі. Былі гэта вырашальныя матчы. Удзельнікі з вялікай ангажаванасцю змагаліся за балы.

Канчаткова перамагла каманда Гайнаўка „IV” у саставе: Андрэй Іванюк, Лукаш Ялоза, Раман Данілюк, Віктар Грыгарук, Юрка Янель, Маргарыта Карпюк і Ірэна Ляйтэр. Другое месца занялі спартсмены Нараўкі, трэцяе — Гайнаўкі „I”.

Спаборніцтвы праходзілі ў сяброўскай атмасферы. Можна было заўважыць здаровае спаборніцтва спартсменаў.

— Спартыўныя спаборніцтвы выканалі сваю задачу, — сказала Уля Янчук, галоўны арганізатар мерапрыемства. — Моладзь рэгіёна мела магчымасць пазнаёміцца, інтэгравацца.

Ева Галавачык, Гайнаўка

Наталля Арсеннева

25-ы Сакавік

Ён прыйдзе, гэты дзень!
Ён не прыйсці не можа!
Ён прыйдзе —
й загудзе вясновы буралом,
пакрышыць, размяце,
раскідае, зніштожыць
усё, што нам шляхі да хаты замяло!
Ці чуеце?
Аб ім
шасціць быльнёг аселіц,
пяюць вятры ў лазе
і звоніць крыгаў лёд.
Ахвяраю крыві
а Слова стане Целам,
і ўжо ніколі больш не ўстане Чорны Год.
Няхай бярэмя він
прыгнула нас, і крылы
апалі,
й хлеб чужы нясмачны і важкі,
няхай нас апавіў
тугой агорклы вырай, —
трывайма!
Ён ідзе —
Вялікі Сакавік!
Ідзе...
й пад ногі рунь
яму кладзецца, таюць
снягі, на паплавох зяленіцца трава...
Радзіма!
Беларусь!
Каханая, святая!
Багаславі нас жыць
і веру захаваць!

Жыве Беларусь!

Радасць жаўранкам звоніць над хмарамі,
хай не згледжу яе, не збяру...
Дні насталі важкія, змагарныя,
зноў
спрабуе расці
Беларусь.
Зноў спрабуе,
із думкамі нашымі,
з дзіўнай, кволаю музыкай слоў...
Слоў,
што кпілі з іх ворагі, страшылі,
што ледзь ветрам іх не замяло.
Наша ж мова —
цудоўная, спеўная,
ўмее спелым калоссем шумець,
галасіць навальніцай улеўнаю,
вераснёваю медзяй звінець.
Мова наша — выкутая з золата —
не іржавее,
блішчыць,
зігаціць.
Гэта мова паэтаў і волатаў,
скарб, які нас трымаў пры жыцці.
Каб не мова,
даўно б мы растаялі,
расплыліся б імглой між чужых,
збеглі ў вырай гусінаю стаяю...
Але з мовай —
і мы будзем жыць.
Будзем жыць!
Днямі яснымі, новымі
пойдзем, пойдзем з табой у гару,
наша жытная
і васільковая,
несмяротная Беларусь!

Напрадвесні

Шэры дзень пазірае ў акно
шэры дзень, як той пух на вярбіне.
Пуста, сіне
й туманна ў палёх навакол.
Ручаінамі звоняць равы
пад лазою, налітаю сокам.
Гэт, высока
ў даль сівую плывуць журавы.
І хоць снег яшчэ ў лесе ляжыць,
хоць з-за хмар льецца жаўранка песня,
ўжо прадвесне,
і так хочацца цешыцца й жыць!

Новая Лука ў гміне Нараўка

Першыя весткі пра вёску Луку паходзяць з першай паловы XVIII стагоддзя. Яе назва ўзялася праўдападобна ад формы рэчышча. Яно ў пяці месцах мела форму „лука". Старэйшыя людзі гавораць, што можа хтосьці страляў тут калісьці з лукаў. Усім людзям з ваколіцы вядомая яшчэ другая назва вёскі — „Хіны". Хаты былі ў цеснай забудове, а на некаторых панадворках стаялі нават дзве хаты. У нядзелю на лавачках заўсёды сядзела многа людзей (было іх многа як у сапраўдным Кітаі).

Новая Лука ўзнікла пасля таго, як залілі вадою вёску Луку. Жыхары атрымалі кватэры ў блёках у Міхалове, Гайнаўцы, Беластоку, Бандарах. Як цяжка было пакідаць свой родны кут, сваю родную хату, можна паглядзець у фільме Тамары Саланевіч. Жменька людзей (7 сем'яў), сапраўдных патрыётаў, задумалі застацца на сваёй бацькаўшчыне і пабудаваць новую вёску. Гэта быў звычайны кавалак ворнай зямлі, побач шашы, два кіламетры ад старой вёскі.

— Хочуць жыць у воўчай яме, — насміхаліся людзі з тых, якія адкінулі прапанову жыць у горадзе.

Калі ваявода даў згоду на пабудову новай вёскі, распачалася цяжкая праца. Спачатку людзі капалі калодзежы і будавалі гумны, каб іхняя жывёла мела дзе жыць. Потым распачалася пабудова дамоў. У той час, калі людзі за свае хаты і гаспадаркі атрымалі грошы, цэгла каштавала недзе 7 зл., а калі распачаліся будовы, яе цана ўзрасла да 46 зл. Новыя хаты ўзводзіліся марудна, аднак людзі паволі выходзілі на „простую дарогу".

Даўно, яшчэ ў Старой Луцэ, стаяў каменны крыж. Быў ён зроблены ў той час, калі ў Семяноўцы будавалі чыгунку. Вельмі многа людзей працавала пры збіранні каменя. На памятку гэтага здарэння яны выбралі самы вялікі камень, завяршылі яго крыжам. Ён стаяў у цэнтры вёскі. Ля крыжа людзі маліліся і развітваліся са сваімі роднымі. Калі людзі выбраліся з Лукі, бацюшка Л. Янкоўскі запрапанаваў перанесці крыж у новую вёску. Зараз ён стаіць у самым пачатку вёскі — ля шашы. Некалькі гадоў пазней бацюшка запрапанаваў пабудову царквы, якая была б помнікам затопленым беларускім вёскам — Гарбарам, Боўтрыкам, Рудні, Будам, Луцэ (яны назаўсёды зніклі з карты Польшчы, а разам з імі — звычаі, культура, архітэктура і шмат-шмат чаго іншага каштоўнага). Людзі патрабавалі часу, каб змірыцца з гэтай думкай, гэта ж быў вялікі выдатак. Аднак ужо ў 1998 годзе мітрапаліт Сава заклаў пад пабудову краевугольны камень. Царкву пабудавалі ў прыгожым месцы, у канцы вёскі. 29 ліпеня 2001 года яе купалы завяршылі тры крыжы.

Новая Лука — вельмі маладая вёска, ёй гадоў 17. Пастаянна пражывае тут за 40 чалавек, але летам іх намнога больш. На адпачынак з гарадоў прыязджаюць сюды тыя, хто пабудаваў тут дачы, прыязджаюць турысты і чужаземцы. Шкада, што вада ў нашым „возеры" не такая чыстая, якой мела быць. Добра, што калі ідзем новымі вуліцамі (якіх тут вельмі многа і ўсе прыгожа названы), можам зайсці ў лес і назбіраць грыбоў. Калі не верыце, прыязджайце і пабачыце самі.

Расказвалі
Марыя і Сяргей Каральчукі
Выслухалі і запісалі
Уршуля Стоцкая
і Аня Каральчук

Дзённік Міколы

Тэатр-кашмар

Была ўжо позняя пара, калі завіталі да мяне сябры. Усе прыйшлі са сваімі пасведчаннямі і ўзнагародамі.

— Міколка, — сказала Марта, — ты адзін можаш нас зразумець!

— У чым справа?

— Паслухай, — Марта сцішыла голас, — мы ледзь прыйшлі ў сябе.

Я глядзеў на сяброў і думаў сваё. Яны, пэўна, рашылі сыграць перада мною нейкую „камедыю" з нагоды канікул. Усе яны былі ў святочным адзенні, нібыта толькі вярнуліся са школьнай урачыстасці.

— Памятаеш як правялі мы цябе дахаты з „Маліны"? — цягнула Аня.

— Але.

— Па дарозе мы зноў сустрэлі Дамініку. Яна несла ў кошыку Чорнага ката. Разумееш?

— Вы зноў пра чары! — усхваляваўся я.

— Нашы новыя сябры — Марта, Міхась, Мілаш і Максім нічога не кемілі, тады я расказала ім пра Ліняцкіх і Чорнага ката, — дадала Аня.

— І ўсе мы падумалі, каб схадзіць да Нор Узі, — прашаптаў Ярак.

— Ага... Ну, гаварыце. Гэта, дарэчы, файная казка, — пазяхнуў я.

— Уяві сабе, што...

— Так, ведаю, — перабіў я Ані. — Вас сустрэла тая Чараўніца. У чорнай сукенцы. Праўда?

— Адкуль ты ведаеш? — не вытрывала Марта. — Якраз так і было.

— Відаць у вашым сцэнарыі не хапае адной ролі. Вось і ўзяўся я імправізаваць яе.

Мае сябры цалкам абселі. Яны, здавалася, яшчэ больш напалохаліся.

— Уяві сабе, Чараўніца, калі ўбачыла нас, дык расплакалася. Яна хутка схавалася.

— І грукнула дзвярыма, — адзначыла Аня.

— А пасля вас сустрэлі Ліняцкія і абярнулі ў мышэй. Так? — я не шкадаваў іроніі.

— Ну так! — усклікнула Марта.

— І яшчэ скажаце мне... што Ліняцкія далей жывуць у нашай камяніцы, яны толькі мяняюць выгляд?

— Цікавая думка, — цягнула Аня. — Падумаць толькі! Чорны Кот кінуўся на нас, калі мы былі мышкамі!

— Гэта кіч! — уздыхнуў я, і хацеў развітацца з сябрамі. Але ў той момант нечакана зайшла да нас госця Нор Узі, Чараўніца.

— Яны не маняць, — сказала.

Пасля Чорная дама махнула чарадзейнай палачкай... і я прачнуўся.

Так пачаўся мой першы дзень канікул.

(працяг будзе)

(нак-с)

Польска-беларуская крыжаванка № 12

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.



Адказ на крыжаванку н-р 8: Газон, акраса, рысунак, пасуда, ода, Ян, кіно, як, муза, адліга, дар. Пята, экран, рыс, ял, ласункі, суд, ганак, закон, доза, нота, ар.

Узнагароды — запісныя кніжкі — выйгралі: **Эвеліна Вакулеўская**, **Кацярына Майсяевіч** і **Альжбета Паўлушэвіч** з Гарадка, **Наталля Міранчук** з Орлі, **Агата Баўтрамюк** з Дубін, **Альжбета Антанюк** з Арэшкава, **Раксана Казлоўская** з Новага Корніна.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Пераможцы конкурсу з настаўніцамі Людмілай Грыгарук (справа) і Гражынай Паўлючук

Рэгіянальная адукацыя

У Комплексе школ распаложаным па вуліцы Новаваршаўскай у Гайнаўцы 28 лютага адбылося адкрыццё Рэгіянальнага кабінета, спалучанае са школьнымі элімінацыямі дэкламатарскага конкурсу „Роднае слова". На ўрачыстасці прысутны былі асветны інспектар Гайнаўскага магістрата Нэля Шчука і намеснікі дырэктара школы Аліна Дзмітрук і Святлана Анішчук.

Мерапрыемства адбылося ў зале, якая знаходзіцца ў падвале школы. Выстаўкі, якія там прэзентуюцца, пераўтварылі яе ў вясковую хату. Побач іконы, памешчанай у кутку памяшкання, вісіць многа вышываных і гафтаваных ручнікоў. Знаходзяцца там рознакаляровыя тканыя вырабы, пасажны сундук і ложак з падушкамі і пярынай. У кутку стаяць даўнія прылады працы: калаўротак, сярпы, дзежка і маслабойка. Вучні III „ц" класа, якія адкрылі ўрачыстасць, паказалі вясковыя гульні. Расказалі яны пра заняткі, якімі займаліся іх вясковыя бабулі. Дзеткі выступілі з беларускімі і польскімі вершамі і песнямі. На калідоры арганізавана была выстаўка старых фатаграфій зробленых у Гайнаўцы і наваколлі. Можна ўбачыць на ёй сямейныя здымкі, фатаграфіі членаў гайнаўскіх грамадскіх арганізацый, царкоўныя і касцельныя здарэнні. Фатаграфіі і экспанаты прынеслі дзеці, бацькі, суседзі і настаўнікі.

Тры гады таму настаўніца інтэграванага навучання Гражына Паўлючук арганізавала ў школе выстаўку „Калі бабуля была малой", ад якой засталася вясковая вопратка і прыгожыя ручнікі, а два гады таму „Крошкі хлеба", на якой паказвалася апрацоўка зерня і пячэнне хлеба. Ад кожнай выстаўкі заставаліся вясковыя прылады працы і вырабы сялян, а год таму пачалі дадаткова збіраць экспанаты з намерам выкарыстаць іх у рэгіянальным кабінеце.

У кабінеце будуць праводзіцца заняткі па беларускай мове, гісторыі і інтэграваным навучанні ў I-III класах. Настаўніца Гражына Паўлючук падрыхтавала аўтарскую праграму рэгіянальнай адукацыі, якую выкарыстоўвае ў час навучання дзетак з I-III класаў. Вучні дакладней знаёмяцца са сваім класам, школай і наваколлем. Апошнім часам дзеткі хадзілі ў парк, лес і на могілкі, гаварылі пра мінулае Гайнаўшчыны. Знаёміліся з апрацоўкай льну, вышываннем ручнікоў і сурвэтак. Наймалодшыя вучацца беларускай мове ў час дадатковых заняткаў. У час інтэграванага навучання чытаюць беларускія вершы, прыказкі і спяваюць беларускія песні.

Публіку ў час урачыстасці сустракалі дэкламатары беларускай паэзіі і прозы. У школьных элімінацыях дэкламатарскага конкурсу „Роднае слова" выступілі 37 удзельнікаў. Мерапрыемства вяла настаўніца беларускай мовы Людміла Грыгарук, якая заадно была членам конкурснай камісіі.

— Дэкламацыі вучняў былі на высокім узроўні. Рэпертуар быў трапна падабраны да ўзросту дэкламатараў, а яго інтэрпрэтацыя была цікавай, — ацаніла старшыня камісіі Наталля Герасімюк з Беларускага музея ў Гайнаўцы.

Да раённых элімінацый перайшлі 12 вучняў: Магдаліна Дарашук, Юстына Іванюк, Лукаш Сахарчук, Дарыюш Несцярук, Вольга Дзік, Юстына Грыгарук, Агнешка Масальская, Марцін Іванюк, Анна Грыгарук, Марыёля Герман, Барбара Каліноўская і Паўліна Леанчук. Усе ўдзельнікі конкурсу атрымалі падарункі.

Аляксей МАРОЗ

„Прабуджэнне" Эвы Нестаровіч

У Галерэі „Маршанд" у Беластоку (Рынак Касцюшкі, 17), у сядзібе Акруговага аддзела Саюза польскіх мастакоў, можна ад 3 сакавіка пазнаёміцца з мастацтвам Эвы Анны Нестаровіч з Любліна.

Маладая мастачка закончыла мастацкае аддзяленне Універсітэта М. Кюры-Складоўскай у майстэрні прафесара Адама Стыкі. Ад 2000 года працуе ў тым аддзяленні як аспірантка, спецыялістка па станковым жывапісе. Малюе карціны сярэдняга фармату, алеем або акрылевай фарбай на палатне і кардоне. Агульна можна сказаць, што яе мастацтва ўпісваецца ў шырока разуметую плынь экспрэсіўнага абстракцыянізму. Гэты выбар, як прызнаецца мастачка — з-за ахвоты „большае свабоды стварання".

Карціны выскальваюцца колерам — чырванню, рознымі адценямі зелені, жоўцю. Гэта сапраўды як „Клубаванне думак" ці „Дождж думак", і ў такім спалучэнні фарбаў, якое рэдка сустрэнеш і ў прыродзе, і на карцінах „гладкіх" жывапісцаў. Асацыяцыі гледачоў на вернісажы таксама былі цікавыя — некаторым тое каляровае клубаванне на палатне ці кардоне здавалася кіпеннем жарсцяў, іншым — пералівам каляровых шлункаў. Сустрэча з вельмі сімпатычнай мастачкай была таксама нагодай для прыемнага правядзення часу ў кавярні „Маршанд", з прыбытку якое частка фінансаў адводзіцца на функцыянаванне галерэі і офіса Саюза мастакоў.

Старшыня аддзела Юзаф Здзех мае надзею, што гэты паказ будзе ўступам да прэзентацыі беластоцкага мастацтва ў Любліне. Маршандская галерэя ёсць, як кажа, пэўнай процівагай да элітарнай выставачнай залы „Арсенал" не толькі таму, што проста з вуліцы або цераз кавярню можна паглядзець карціны самых розных мастакоў, не толькі такую абстракцыю, як у Эвы Анны Нестаровіч.

Міра ЛУКША

Роднае слова

Пад такім лозунгам 27 лютага г.г. у будынку дубіцкага ГОК адбыўся ўрачысты конкурс, у ходзе якога вучні нашай школы чыталі на сцэне кароткія гумарыстычныя тэксты аўтараў „Белавежы" і з Беларусі. Мяне таксама запрасілі на мерапрыемства і шчырае дзякуй за гэта арганізатарам: Марыі Казімерук — настаўніцы беларускай мовы і Міраславе Семянюк — кіраўніку дубіцкай бібліятэкі.

Выступалі вучні I-III класаў — каля трыццаці; IV-VI класаў — каля пятнаццаці; і вучні дубіцкай гімназіі — за дзесяць. Дэкламацыя вершаў праходзіла на высокім узроўні і толькі лічаныя адзінкі крыху хваляваліся і збіваліся, але пасля папраўлялі свае хібы. Камісіі пасля заканчэння конкурсу цяжка было выявіць пераможцаў, бо ўсе праявілі сябе выдатна.

Хочацца адзначыць яшчэ і тое, што ў час, калі я сам вучыўся, такіх спаборніцтваў амаль не было і не было ў модзе беларускае слова, не было такога дэкламатарскага мастацтва; параўноўваць тое з сённяшнімі абставінамі, гэта як ноч з днём. І вучні тады былі апрануты як жабракі і ў час перапынкаў паводзілі сябе малакультурна. А сёння вучні прыгожа апранутыя, абутыя, чыстыя, ветлівыя і могуць прыгожа гутарыць на чыстай літаратурнай беларускай мове; абы толькі больш адвагі і рашучасці. А гімназісткі выглядаюць як паненкі, хоць ты іх замуж аддавай; калісь такога не было і народ так буйна не рос. Было гэта з-за таго, што бяда часта заглядала ў вочы, хаця яе і сёння не бракуе. Аднак час сваё робіць і для ўзросту, і для прагрэсу.

Мікалай ПАНФІЛЮК

Беларускі каляндар 2003

Для тых, хто любіць чытаць па-беларуску, варта купіць „Беларускі каляндар 2003". Кніжка танная, даступная (каштуе толькі 5 зл.) і цікавая.

Каляндарная частка ілюстравана беларускім народным адзеннем — 12 фотаздымкаў і малюнкаў. Багатая таксама гістарычная частка выдання. Вучняў і студэнтаў зацікавіць артыкул Анны Бжазоўскай „Нашы першыя асветнікі". Дасланыя з Мінска два нарысы да 120-годдзя Якуба Коласа і Янкі Купалы задаволяць кожнага чытача. Вельмі цікава аб беларуска-польскіх літаратурных сувязях піша Базыль Белаказовіч. Гэта дасканалы матэрыял для філолагаў. Звычайнаму чытачу даспадобы будзе „Летапіс дзейнасці БГКТ" аўтарства Валянціны Ласкевіч, ілюстраваны больш за 70 здымкамі нашых самадзейных фатографаў.

Некалькі змястоўных артыкулаў напісаны па матэрыялах Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь, напрыклад, „Аб заканадаўстве Беларусі ў галіне забеспячэння правоў, якія належаць да нацыянальных супольнасцей".

У канцы кніжкі — падборка вершаў Віктара Шведа і Юрыя Баены.

„Беларускі каляндар 2003" прыемна ўзяць у рукі (на вокладках каляровыя здымкі спявачак у народным адзенні) і паставіць на кніжную паліцу.

Мікалай ВАРАНЕЦКІ

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Славамір Рыбак (справа) з сябрам-настаўнікам мызыкай з Нурца Міраславам Шатыловічам на выставе ў Беларускім музеі ў Гайнаўцы

Рыбак у Беларускім музеі

Славамір Рыбак працуе настаўнікам геаграфіі ў Нурцы-Станцыі. Мастацтвам (адразу маляванне алеем на палатне) заняўся ў час навукі ў Філіяле Варшаўскага універсітэта ў Беластоку. Тады найчасцей маляваў у час канікул — увекавечваючы прыгажосць хвіліны і прыроды. Захапляе выдатная тэхніка, дакладнасць выканання, а адначасова свежасць і спантаннасць. Крытыкі падкрэсліваюць умеласць аўтара ў перадачы настрою, нейкай паэтычнасці ў падборцы колераў, багатую палітру фарбаў.

— Да варштату даходзіў я самастойна, без падказак, — кажа мастак.

Рэалістычныя, моцныя карціны з жыцця вёскі, з наднарвянскае прыроды (цудоўныя вобразы вады) хвалююць, прыгадваюць дзяцінства і свежае адчуванне тады кожнае хвіліны, заўсёды новае, якое засталося назаўсёды ў памяці, азываюцца лірычным водгаласам.

Малюе ад 18 гадоў. Паказваўся на 12 індывідуальных выставах, прымаў удзел і быў лаўрэатам конкурсаў (м.інш. Агульнапольскага біенале непрафесійнага мастацтва імя Юзафа Хэлмонскага).

Славамір Рыбак і яго мастацтва — вельмі папулярныя сярод наведвальнікаў выставак і пакупнікоў. Не высільваецца ён на „арыгінальнасць", не крыўляе рэчаіснасці ў абстракцыйным люстэрку. Ідзе ўласнаю дарогай, „далінай Арлянкі", сярод „яшчэ такіх краявідаў", поўны „Асенніх мараў", цытуючы „Веснавыя страфы Падляшша"... Міра ЛУКША

Перформер Уладзімір Караткевіч

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Музей Уладзіміра Караткевіча ў Оршы

Пра Уладзіміра Караткевіча і „Ніву" ёсць легенда.

У 1965 годзе на старонках нашага тыднёвіка друкаваліся вершы і фатаграфія літаратара з мядзведзем. Нашы чытачы палічылі Караткевіча „белавежцам" ды журналістам „Нівы".

Пасля ў Мінску хадзілі чуткі — як тут у „Ніве" мы не маглі адбіцца ад званкоў. Нам дзень і ноч званілі і пыталі пра звяра. Многія жадалі пабачыць мядзведзя на ўласныя вочы, прыносілі ў рэдакцыю мёд, ласункі.

Тадышні рэдактар „Нівы" ўсю гісторыю каментуе ўсмешкай:

— Друкавалі Караткевіча, — Георгій Валкавыцкі памятае як сёння, — вершы пайшлі з першай старонкі.

* * *

У час, калі чытачы „Нівы" жадалі пабачыць беларускага літаратара з мядзведзем, Уладзімір Караткевіч разам з Янкам Брылём і Рыгорам Барадуліным падарожнічалі па Магілёўшчыне і Віцебшчыне, наведалі між іншым Оршу.

Зараз, трыццаць сем гадоў пазней, мы ехалі знаёмымі літаратару каляінамі.

За свой літаратурны дэбют Уладзімір Караткевіч лічыў нарыс „Вязынка" — літаратурны рэпартаж пра падарожжа ў месца нараджэння Янкі Купалы.

Мы выбіраліся з Лявок, апошняга прыстанку Купалы, і ехалі ў родны горад Караткевіча. Адсюль 28 кіламетраў у Оршу. Па дарозе мінаем указальнік „Колхоз Янки Купалы".

— А ёлкі-палкі! — здзіўляемся. — Ці не перасяклі мы ўжо мяжы з Расіяй?

Чамусьці ўсе назовы калгасаў на Віцебшчыне на рускай мове, вёскі і мястэчкі пазначаны беларускімі ўказальнікамі.

Орша вядомая з XI стагоддзя. Помнікі старажытнасці — як Аршанскі замак, Куцеінскі Успенскі і Куцеінскі Богаяўленскі манастыры, манастыр трынітарыяў, Святадухаўская царква — не захаваліся. У час апошняй вайны горад згарэў амаль датла.

* * *

Згарэў родны дом Уладзіміра Караткевіча. У Оршы прыдумалі спосаб. З лютага 2002 працуе музей. Будынак стаіць у цэнтры горада, насупраць помніка Леніну.

— Да вайны тут стаяў радзільны дом, дакладна ў гэтым месцы, у 1930 годзе, нарадзіўся Уладзімір Сямёнавіч, — інфармуе нас рускамоўная працаўніца музея.

Пасля вайны Караткевічы жылі па вуліцы Касманаўтаў. Ёсць пра вуліцу верш, ім ганарацца ў Оршы:

У горадзе без тралейбусаў,
над імклівай нямоўчнай ракой,
На вуліцы Касманаўтаў — хата маці маёй,
На вуліцы Касманаўтаў, дзе ўлетку бубняць чмялі,
На самай мне любай вуліцы з усіх,
што ёсць на зямлі...
Пасталі дамы ў пажары каралавых арабін —
Шаснаццаць аднапавярховых
і двухпавярховы адзін.
А поруч з імі ўзносяцца над стромай садоў залатых
Велічны гмах піўзавода і дом
*Грамады Глухіх...**

Пра вуліцу ёсць тасама і іншая гісторыя — расказваюць яе як анекдот. Пасля смерці літаратара-класіка Саюз пісьменнікаў БССР выступіў з прапановай пераназваць вуліцу Касманаўтаў на вуліцу Уладзіміра Караткевіча. Даказвалі, што „касманаўты" не мелі рэальнага дачынення да месца нараджэння пісьменніка.

— Як не мелі? — абурыліся гарадскія ўлады. — Ведзь касманаўты праляталі над Оршай!

* * *

— Наш музей узнік па ініцыятыве мясцовых улад, — быццам у адказ кажа працаўніца музея. Абураецца, калі ўголас каменціруем граматычныя і моўныя памылкі ў надпісах на стэндах. Праўда, нас абслугоўвала касірша; хаця была працоўная гадзіна, экскурсавод пайшоў дахаты.

— Нада раньшэ пазваніць, — папракае нас кабета, — чалавек ня будзе сідзець і вас ажыдаць.

У Музеі аўтабіяграфічная экспазіцыя. Мэбля, сямейныя памяткі, фатаграфіі, кнігі. Экспанаты прывезены з мінскай кватэры пісьменніка. Спадчыну захавала і перадала пляменніца літаратара.

Адносна многа месца займаюць кадры з фільмаў. Караткевіч пісаў сцэнарыі, прымаў удзел у здымку сваіх твораў.

На адным здымку ён разам з мядзведзем. Ці не з гэтым, які нарабіў шуму ў „Ніве"?

* * *

Лічыў — аўтар гэта мастак, ён павінен абрастаць у легенды, міфы. Не любіў сляпога паўтору, прапаганды.

— Мы ўсё пішам пра тое, як „Ганна завіхалася ля печы", — казаў, — а трэба пра незвычайнае, яркае, таямнічае. Каб нельга было адарвацца ўсю ноч.

Як першы беларускі пісьменнік прымусіў чытаць свае беларускамоўныя творы абруселых маладзёнаў і падлеткаў. Закранаў „неіснуючыя" гістарычныя тэмы і даваў іх чытачу ў форме самых папулярных жанраў, як дэтэктыў. Нездарма празывалі яго беларускім Сянкевічам.

Сам не любіў, калі яго называлі рамантыкам, У адным інтэрв'ю сказаў: „Я не пісьменнік рамантычнага складу. Хто хоча каб я яго паважаў — хай здасць гэта азначэнне, гэты ярлык у архіў. Я можа больш чым хто авантурыст, і жыццё падсоўвае мне і такіх людзей, і такія выпадкі, якія не назвеш штодзённымі".

Быў на свой спосаб літаратарам-перформерам. Рэчаіснасць не толькі назіраў, часта станавіўся яе акцёрам і рэжысёрам. Ажыццяўляў сябе ў руху, дзеянні. Цаніў справу. Сябрам гаварыў:

— Вы прыгожа гаворыце, але гэтага мала. Са слоў кашы не зварыш. Вы лепш зрабіце — напішыце, дапамажыце, абараніце.

Заўсёды, калі не лічыць перыядаў дэпрэсіі, безупынна быў у руху. Аб'ездзіў Савецкі Саюз, пабываў у Чэхаславакіі, Польшчы. Тут, дарэчы, праславіўся як першы пісьменнік, які заначаваў на Марыяцкай вежы. У Менску пайшлі чуткі, быццам у тую ноч гейналісты, упершыню ад 450 гадоў, не трубілі.

Уладзімір Караткевіч

* * *

Перформенс з мядзведзем і „Нівай" сам з сябе абярнуўся ў легенду.

Дванаццаць гадоў пасля публікацыі Караткевіч прыязджае ў Варшаву. У беларускім клубе ладзяць яму вечарыну. Верныя чытачы „Нівы" зноў распытваюць пра мядзведзя.

Караткевіч быццам толькі і чакаў, з маршу распавядае пра апошнія мядзведжыя выбрыкі:

— Перад ад'ездам выкупаў я яго ў ванне, а ён выйшаў у пярэднюю і ў вялікім люстры ўгледзеў свой адбітак. Прыглядаўся сабе хвіліну, потым грымнуў з усяе сілы лапай.

Публіка заліваецца смехам, пісьменнік разам з усімі.

Каб зразумець нешта з гэтай гісторыі, трэба вярнуцца да „Нівы". Гартаю карэспандэнцыю за 1965 год.

— *Дарагі таварыш Валкавыцкі!* — піша „ўласнік" мядзведзя. — *Уцёк я з Мінска на Урал, куды далей, каб мець магчымасць папрацаваць без перашкод. Дасылаю вам абяцаную здымку. Гэта я гуляю са сваім мядзведзем. Ён трапіў у пашпарт выпадкова, а тут у мяне няма ніякіх іншых.*

Далейшую „выпадковасць" высветліць нам нарыс Адама Мальдзіса „Жыццё і ўзнясенне Уладзіміра Караткевіча".

Перад ад'ездам на Урал Караткевіч супрацоўнічае з „Беларусьфільмам". Здымаюць беларуска-чэшскую стужку „Пушчык едзе ў Прагу". Аднойчы кінаработнікі заходзяць разам з мядзведзем „Пушчыкам" на кватэру пісьменніка. Мядзведзя найперш купаюць у ванне, пасля кладуць спаць на канапе літаратара. Самі сядаюць за стол, абедаюць. Уладзімір Караткевіч ідзе прытуліцца да мядзведзя, і гэты момат увекавечвае фатаграфія.

Мядзведзь-акцёр родам з Беларускага цырка.

Ганна Кандрацюк

* *Вуліца Касманаўтаў.*

**Скарыстаная літаратура: *У. Караткевіч, Летапіс жыцця і творчасці*; інтэрв'ю Таццяны Шамякінай з У. Караткевічам *Самая цікавая навука — жыццё*; інтэрв'ю А. Лубіч з У. Караткевічам *Нельга не быць гісторыкам*; Адам Мальдзіс, *Жыццё і ўзнясенне Уладзіміра Караткевіча*; Георгій Валкавыцкі, *Віры*; Адам Мальдзіс, *Гісторыя ўвасобленая ў драматычным дзеянні*.

Рыгор Барадулін, Уладзімір Караткевіч, Янка Брыль у час вандроўкі па Беларусі, чэрвень 1965 г.

Фота ВІКТАРА БУРЫ

Трахім-музыка

Гаўрыіл і Іаанна Клімовічы займаліся на 8-гектарнай гаспадарцы ў Свіслачанах. Зямля тут слабая, тады трэба было шукаць дадатковага заробку. Гаўрыіл навучыўся дойлідству і сталярству — ставіў жылыя дамы і халодныя будынкі, вырабляў вокны, дзверы і іншую сталярку.

Калі ў 1915 годзе набліжаўся фронт, Клімовічы з трохгадовым Аляксандрам, як і астатнія дзевяноста свіслачанскіх сем'ў, выехалі ў глыб Расіі. У бежанстве нарадзіўся другі сын — Трахім. Было гэта 14 красавіка 1917 г. у сяле Лапатня Балашоўскага ўезда Саратаўскай вобласці.

Пасля вяртання на радзіму хлопцы памагалі бацьку і на гаспадарцы, ды пры цясельскай і сталярскай справах. У 1938 г. Трахіма прызвалі ў войска. Служыў ён у 81 пяхотным палку 3 дывізіі ў Гродне, пад камандаваннем палкоўніка Банашка. У 1939 годзе стралок Трахім Клімовіч меў быць пераведзены ў запас і вярнуцца дадому. Аднак успыхнула нямецка-польская вайна і яго часць апынулася пад Скярневіцамі. Ваяваць з нямецкай навалай давялося вельмі коратка і ўжо 8 верасня ў мястэчку Пшысуха папаў ён у няволю — на два з паловай года. За гэты час спазнаў ён тры лагеры — у Герліц, Ламсдорфе і Штаблаку.

Немцы да палонных ставіліся вельмі жорстка. Лягчэй стала, калі лагеры апынуліся пад адміністрацыяй цывільнай службы, а за палоннымі сталі сачыць нямецкія запаснікі. Польскім салдатам дазвалялі нават наведваць суседняе мястэчка.

— У лагеры разам са мной быў акардэаніст Шайпак з-пад Ліды. Я з ім сябраваў і вучыўся ў яго іграць. Узнікла тады ў мяне жаданне мець свой гармонік. Праз нейкі час набыў я 32-басавы акардэон і час ад часу весяліў зняволеныя салдацкія душы. А ўзяць у рукі акардэон у лагерных умовах не было так проста.

У лютым 1942 г. Трахім з сябрамі з Палесся ўцяклі з лагера.

— Дабіўся я памалу да сваіх Свіслачан. Солтыс Макар Пятэльскі дапамог мне аформіць дакументы і я ўладкаваўся на працу ў лесе дрывасекам. Пасля вызвалення дапамагаў я бацькам на гаспадарцы. Былі ў нас 2 каровы, конь, пару свіней і авечак. Пасвіў я таксама кароў у гаёвага Кірылы Мельнічака з Мастаўлян. Зарабіўшы трохі грошай пад канец 1944 г. паехаў я ў Беласток на базар. Там жанчына прадавала новенькі 120-басавы акардэон маркі „Гохнер". У мяне не было столькі грошай, а аматараў купіць акардэон было многа. Даў я тады жанчыне задатак і паабяцаў неўзабаве прывезці рэшту грошай. Праз тры дні я зноў быў у Беластоку. За гэты час акардэон сніўся мне кожнай ночы. І ўрэшце мара здзейснілася. Заплаціўшы 32 тысячы злотых „Гохнер" стаў маёй уласнасцю. Раней ён належаў польскаму афіцэру, які загінуў на вайне.

І так Трахім стаў музыкантам-самавукам. А іграў ён на вяселлях, забавах, хрысцінах, дзяржаўных урачыстасцях па ўсёй усходняй Беласточчыне. Аднойчы моладзь з Боўтрык запрасіла Трахіма пайграць на забаве з нагоды царкоўнага фэсту на Міколу ў Бахурах. Пасля забавы музыкант паснедаў і раніцай вяртаўся на матацыкле дадому. Прыпякала ўжо сонца і стомлены музыкант вырашыў адпачыць у лесе.

— Паставіў я матацыкл, гармонік паклаў каля сябе і заснуў. Калі прачнуўся, гармоніка не было. Сэрца сціснулася ад жалю. Што рабіць?

Заявіў Трахім аб пакражы ў міліцыю, а сам стаў ездзіць у Беласток на базар і наглядаць за гандлярамі. Аднойчы заўважыў свой акардэон і выклікаў міліцыю. Трахімавы „Гохнер" меў сакрэтныя паметкі вядомыя толькі ўладальніку. Злодзеем аказаўся жыхар Бахуроў.

„Свіслачанец" — так у народзе называюць Трахіма Клімовіча — хаця адзначыў ужо 87-я ўгодкі, далей іграе пенсіянерам у клубе, сваім знаёмым. Як і раней пальцы музыканта выбіваюць на клавішах задушэўныя акорды.

Віктар Бура

Ці новы крыжовы паход?

Пачатак 2003 года прыносіць народам свету трывожныя весткі пра падзеі вакол малой блізкаўсходняй дзяржавы — Ірака. Амерыканскі прэзідэнт Джордж Буш набраў ахвоты ашчаслівіць амерыканскі і іншыя народы новаю ваеннаю завірухай. Ён нават гатовы не ўлічваць меркавання ААН на гэты конт і пайсці вайною супраць Ірака; калі б так сталася, можна будзе тое смела назваць агрэсіяй.

Прэзідэнт Буш намагаецца ўцягнуць у той канфлікт членаў абарончага саюза НАТА. Паяўляецца тады пытанне: дзеля якой мэты існуе гэты саюз, які ў далейшай будучыні мае пашырыцца на краіны Прыбалтыкі і іншыя?

Як памятаем, паўночнаатлантычны пакт быў заснаваны дзеля абароны заходніх дзяржаў ад пагрозы з боку Савецкага Саюза. Савецкі Саюз перастаў існаваць, а за ім перастаў дзейнічаць і Варшаўскі дагавор, у склад якога ўваходзіла і наша дзяржава. Нягледзячы на гэта НАТА далей існуе ды яшчэ пашыраецца на былыя сацыялістычныя дзяржавы. Да таго ж, як інфармавалі некаторыя польскія газеты, ЗША хадайнічаюць, каб на тэрыторыі нашай краіны пабудаваць свае ваенныя базы. Намеснік міністра абароны Януш Земке ў крывадушны спосаб тлумачыў па тэлебачанні, што амерыканцы хочуць толькі карыстацца нашымі палігонамі дзеля абучэння сваіх жаўнераў. А ці ж гэта не тое самае? Хай амерыканцы абучаюцца ў сябе — маюць там дастаткова прасторы.

Добра помнім, як амерыканскія і натаўскія самалёты безадказна бамбілі гарады і сёлы Югаславіі. Была гэта агрэсіўная вайна, у якой загінулі дзесяткі тысяч мірнага насельніцтва. За тое злачынства ніводзін агрэсар не быў прыцягнуты да адказнасці.

Цяпер прэзідэнту Бушу захацелася іракскай нафты, дык прыдумалі, што Садам Гусейн вырабляе зброю масавага знішчэння. Міжнародная камісія ад ААН на працягу трох месяцаў не знайшла тае зброі, аднак Буш не пакідае сваіх агрэсіўных планаў і рыхтуецца да новага, на маю думку, крыжовага паходу, як калісь крыжаносцы супраць іншаверных.

Прэзідэнт Буш заахвочвае сваіх натаўскіх саюзнікаў далучыцца да агрэсіўных дзеянняў супраць Ірака. Больш разважлівыя члены пакта, як Нямеччына, Францыя і Бельгія, рашуча адмаўляюцца ад ваеннай авантуры. Вайну можна вельмі хутка распачаць, толькі невядома, як яе закончыць; пераканаўся аб гэтым галоўны ініцыятар другой сусветнай вайны, добра вядомы старэйшаму пакаленню Адольф.

Простаму грамадзяніну цяжка зразумець стаўленне да гэтай справы кіруючых дзяржавай асоб. Польскія патрыёты кіраваліся калісь лозунгам „За нашу і вашу свабоду". Гэта абазначае, што палякі не будуць ваяваць супраць незалежнай дзяржавы, якою з'яўляецца Ірак. У народзе існуе жартаўлівая прыказка пра стаўленне кіраўнікоў нашай дзяржавы да амерыканска-іракскага канфлікта: „Дзе каня куюць, там і жаба падстаўляе сваю нагу, каб і яе каваль падкаваў".

Дзяржава наша ўступіла ў НАТА дзеля супольнай абароны ад агрэсара. А дзе той агрэсар, мы, простыя грамадзяне, не ведаем. Гавораць, што тэрарысты здзейснілі тэракт у Нью-Йорку. Здарылася гэта ўнутры самой дзяржавы, ніводзін тэрарыст не ўчыніў гэтага тэракту звонку. Няхай амерыканцы ўнутры сваёй дзяржавы пільнуюць сваіх гарадоў і самалётаў; пры чым у гэтай справе Ірак ці іншыя краіны?

У адной з перадач беластоцкага радыёвяшчання ад канца студзеня паведамлялася, што Літва задаволіла просьбу амерыканцаў і дазволіла іх ваеннай авіяцыі карыстацца сваёй паветранай прасторай і аэрадромамі ў час вайны супраць Ірака. Дзе Літва, а дзе Ірак, і як тыя самалёты будуць весці ваенныя дзеянні? Такія падзеі прыводзяць да высновы, што наступнымі ахвярамі амерыканскай авантуры будуць несумненна краіны мяжуючыя з НАТА.

Натаўскія краіны мяняюць сваё ўзбраенне. Наша дзяржава, не зважаючы на крытычны стан эканомікі — больш за 3,5 мільёна беспрацоўных — купляе за 8 мільярдаў долараў 46 амерыканскія самалёты „F-16". Ці тымі самалётамі ўрад дасць утрыманне штораз бяднеючым сваім беспрацоўным грамадзянам? Беспрацоўныя патрабуюць працы і хлеба, а новыя самалёты ў нашых абставінах лічу непатрэбнымі.

Гэта мае асабістыя думкі пра падзеі, якія трывожаць грамадства.

Юстын Пракаповіч

Еўрасаюз, як ты мне мілы...

Не з гэтага рэгіёна

Мой сваяк з вёскі любіць прыехаць час ад часу да дачкі ў Беласток. Адчувае сябе ў яе добра не толькі таму, што тут цёпла, хаця ў печы не трэба паліць, і не толькі таму, што новенькая ў яе мэбля ды і абсталяванне на кухні як у амерыканкі якой. Гонар распірае яго ад таго, што ўсё гэта прыдбаў ён дзякуючы сваёй цяжкой працы на зямлі. Так, грошы ў балота не выкінуты, думаў ён няраз, няхай і яна жыве, як усе гараджане. Горад асацыіраваўся яму з поўным дастаткам, дабрабытам.

Але нядаўна яго погляд на горад радыкальна змяніўся. Вядома, вясковы чалавек устае рана. Была мо гадзіна пятая, калі мой сваяк пачуў нейкую калатнечу на панадворку, каля блёка. Выглянуў у акно. Два мужыкі сварыліся каля сметніка. Сваяк паціхеньку, каб не будзіць нікога ў хаце, выслізнуўся з кватэры і сышоў уніз. Цікава, што там такое, думаў ён.

Першае, што ён убачыў, было тое, як чалавек з доўгім крукам у руках корпаўся ў прыблёкавым сметніку. Ён з нейкай зацятасцю вываварочваў „банякі", напоўненыя звечара рознымі адыходамі, вытрасаў з іх тое смецце, гробся ў ім, шукаў, выбіраючы крукам некаторыя рэчы, і адкладаў іх на бок.

Увагу вяскоўца звярнула тое, што чалавек быў апрануты ў касцюм і кашулю з гальштукам, а да таго быў настолькі добра выхаваны, што не звяртаў увагі на другога чалавека, які неведзь чаму прычапіўся да яго і лаяў апошнімі словамі. Відаць, не хацеў зніжацца да яго ўзроўню, не агрызаўся.

Урэшце ён не вытрымаў. „O co panu chodzi?" — спытаў ён з недаўменнем.

„Bo pan nie z tego regionu! Proszę zostawić ten śmietnik!" — адказаў другі аматар смецця катэгарычна.

А Божачкі, што ж тут чаўпецца ў гэтым горадзе, то нават і сметнікі ўжо падзялілі на рэгіёны, падумаў сваяк і чым хутчэй сабраўся дахаты на вёску.

Выслухала Ада Чачуга

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Размаляваны прыпынак у Орлі

Прыпынак ПКСу ў Орлі мяжуе з прыгожым будынкам Гміннай управы. З пачатку свайго існавання вылучаецца ён сваім паскудным выглядам, а нярэдка і пахам, ды з'яўляецца агіднай візіткай гміннага цэнтра. Раней яго сістэматычна прыбіралі, а цяпер быццам ніхто пра гэта і не клапоціцца.

Паводле пастановы, для ўтрымання парадку вызначаны працаўнік управы, які мае абавязак раз у дзень (апрача субот і нядзель) у ранніх гадзінах прыбраць нужнік і прылягаючае месца. Бывае па-рознаму, асабліва з нужнікам і перапоўненым сметнікам. Апошняй восенню, пасля выбараў, прыпынак пакрэмзаны ўсярэдзіне, а звонку вітае непрыстойным і абразлівым надпісам. Бударажыць гэта многіх жыхароў, паводле якіх прыпынак быў бы прыбраны, калі б ішло да выбараў. Улад і радных графіці тое, відаць, не цікавіць. З размаляванага прыпынку штодзённа ад'язджаюць дзеці ў школу, а дарослыя на працу. Высаджваюцца тут дзеці і сотні прыезджых чужых людзей (асабліва многа іх кіруецца да арлянскіх знахарак). Калісь гаспадар гміны задумаў паставіць побач прыпынку слуп з аб'явамі, значыць, каб людзі асабліва наведвалі такое „прывабнае" месца.

Ці такая візітка ў цэнтры Орлі патрэбная? У лютым запытаў я Ірэну Адзіевіч, сакратара гміны і намесніка войта, хто павінен прыбіраць прыпынак. Яна адказала, што Гмінная ўправа, але цяпер маразы. І спытала мяне, ці варта пра гэта пісаць, калі і я сам з Орлі. Падобна размаляваны прыпынак ёсць і ў Вольцы.

Міхал Мінцэвіч

Фота АНДРЭЯ ГРЫГАРУКА

Пераможцы з Гайнаўкі: (з гары ад левага боку) Яраслаў Смэля, Патрык Грыгаровіч, Ірэна Ляйтэр, Міхал Скепка; (знізу ад левага боку) Агнешка Пуц, Адам Шпарло і Павел Германюк.

Турнір ў Гайнаўцы

У Гайнаўцы 22-23 лютага ў спартыўнай зале Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы адбыўся валейбольны турнір, які адзінаццаты раз арганізавала Брацтва праваслаўнай моладзі. У першы дзень 16 спартыўных камандаў іграли ў чатырох групах. Вельмі многа было валейбалістаў з Гайнаўкі.

Турнір распачаў бацюшка Андрэй Буслоўскі. Усе прысутныя праспявалі малітву „Цару Нябесны". Бацюшка сказаў пропаведзь пра ролю спорту ў духоўным жыцці чалавека. Пазней іграли валейбалісты з Беластока, Нарвы, Нараўкі, Дубіноў і Гайнаўкі. Самымі лепшымі аказаліся мясцовыя спартсмены. У нядзелю 23 лютага вылучаны былі лепшыя каманды.

Першае месца заняла каманда ў складзе: Маргарыта Карпюк, Ірэна Ляйтэр, Андрэй Іванюк, Юры Янель, Раман Данілюк, Лукаш Ялоза, Віктар Грыгарук. Другое месца занялі старэйшыя прадстаўнікі Нараўкі (Нараўка ВДТС). Трэцяга месца дабіліся былыя вучні нашай школы, якімі кіравала Ілона Карпюк. На чацвёртым месцы апынулася каманда з Дубіноў.

Вядучыя мерапрыемства ўзнагародзілі самых лепшых спартсменаў.

Пры арганізацыі турніру асабліва вылучыліся старшыня Брацтва праваслаўнай моладзі, Агнешка Пуц, а таксама настаўнікі фізкультуры: Юры Янель, Сяргей Юзючук і Раман Данілюк. Агучэннем імпрэзы займаўся нястомны Павел Валкавыцкі, які заўсёды іграе на ўсіх дыскатэках, конкурсах і сустрэчах.

Лічу, што гэта было сапраўднае спартыўнае свята. Дзякую ўсім арганізатарам за добрую падрыхтоўку і ўдзельнікам за ігру.

Андрэй Грыгарук

Вер – не вер

Дарагі Астронку! Прысніўся мне смешны сон. Вось нібы я накупіў рознага алкаголю ў вельмі прыгожых бутэльках. Было іх аж чатыры. А зрабіў я гэта таму, што дамовіўся з сябрам сустрэцца ў рэстаране. Дык, думаю, будзе што выпіць. Чаму, ідучы ў рэстаран, я вырашыў купіць алкаголь, не ведаю. Там, убачыўшы нібы свайго сябра (у сапраўднасці гэта быў акцёр, якога я нядаўна бачыў у французскім фільме), я даў яму бутэльку каньяку. Ён яе ўзяў і выпіў каньяк проста з бутэлькі. Я вельмі здзівіўся, што ён выпіў адразу цэлую бутэльку, а мяне нават не пачаставаў. А ён мне гаворыць, што нічога не здарылася: рускі алкаголь танны. Я абурыўся і кажу, што ўсё французскае. Трымаю ў руках наступную, вельмі прыгожую бутэльку і збіраюся яму яе даць.

А пасля я апынуўся ў шпіталі. Быццам я ўбачыў у калідоры свайго начальніка і запрасіў яго ў сваю палату. Ён зайшоў да мяне: палата вялікая, сонечная. Майму госцю яна вельмі спадабалася, асабліва — што такая прасторная. Раптам, адкуль не вазьміся, заўважаю, што ў палаце поўна жаночай вопраткі, у асноўным ружовага колеру. Уся яна акуратна вісіць на вешалках пасярэдзіне пакоя. Так, як у крамах. Многа радоў гэтай вопраткі. Увесь пакой застаўлены тымі вешалкамі. Вопратка новая.

Што гэтыя сны могуць абазначаць?

Пятро

Пятро! Твой першы сон, на жаль, гаворыць за тое, што ёсць у цябе нейкі дурнаваты сябра. Дзякуй Богу, што сам ты не піў алкаголю, бо магло б гэта абазначаць, што чакае цябе нейкая страта, прыніжэнне, беднасць. А так тое, што ты бачыў у сне алкаголь, можа абысціся ўсяго галаўным болем.

Што датычыцца твайго другога сну, дык мушу цябе абрадаваць: бальніца прадвяшчае здароўе, поспехі, прыбытак. Наведванне хворых абазначае неспадзяванае шчасце: мо атрымаеш павышэнне па службе, бо цябе ж наведаў сам начальнік. Тая ружовая жаночая вопратка можа прадвяшчаць табе нейкі паварот у карысны бок мужчынска-жаночых спраў.

Астрон

Змова маўчання

Прадпрыемства рэгіянальных пасажырскіх перавозаў у Беластоку заявіла, што ад 1 лютага зменшыць колькасць чыгуначных маршрутаў у Падляшскім ваяводстве. Паколькі на раскаладзе руху гайнаўскія чыгуначныя лініі памечаны літарай „G", войт Чаромхаўскай гміны разам з парламентарыямі Яўгенам Чыквіным, Аляксандрам Чужам і віцэ-старастам Гайнаўскага павета Ежы Сіракам падаліся ў Варшаву да дырэктара Рэгіянальных пасажырскіх перавозаў, каб прасіць аб захаванні чыгуначнага транспарту ў нязменным відзе.

— Паездка ўдалася, — заявіў войт Чаромхаўскай гміны Міхал Врублеўскі. — На лініі Седльцы — Чаромха — Гайнаўка будуць надалей курсіраваць цягнікі, хаця колькасць іх можа паменшыцца. Невядома, што будзе з лініяй Чаромха — Беласток. Неафіцыйна я даведаўся, што ўсё застанецца па-ранейшаму да чэрвеня, г.зн. да еўрасаюзнага рэферэндуму (не хочуць хваляваць грамадскасць).

У тым, што лінія Седльцы — Чаромха — Гайнаўка не будзе ліквідавана, можна быць упэўненым. Паводле закону з'яўляецца яна дзяржаўнай (на спіску знаходзіцца яна пад нумарам 17). Наконт лініі Чаромха — Беласток Беластоцкае прадпрыемства чыгуначных ліній паведаміла Староства ў Гайнаўцы, што ў мінулым годзе было выменены 3 859 штук шпалаў (больш 80%). Аднак капітальны рамонт не можа быць завершаны, паколькі лінія не занесена ў спісак стратэгічных ліній (як лінія Седльцы — Чаромха — Гайнаўка). Адно мяне бударажыць: на рамонт беспаспяхова выдалі на працягу трох гадоў вялікія грошы. Па-мойму на лініі Чаромха — Беласток цягнікі малі б курсіраваць з хуткасцю 50 км/гадз. На прапанову мясцовых самаўрадаў чыгуначныя дырэктары пазбягаюць даць станоўчы адказ, захоўваючы змову маўчання. Неафіцыйна гаворыцца аб ціхай змове чыгункі з ПКСам. Мне здаецца, што настаў час, каб справай пацікавіліся органы правапарадку і дзяржаўнага кантролю.

Уладзімір Сідарук

PS. Ад 1 лютага на станцыі Чаромха не ліквідавана ніводнага цягніка. Раней на 13 мінут ад'язджае толькі поезд у Варшаву.

Ніва ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Мірановіч.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Віталь Луба.
Сакратар рэдакцыі: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", ul. Składowa 9, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na III kwartał 2003 r. upływa 5 czerwca 2003 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na III kwartał 2003 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 115,00; pocztą lotniczą Europa — 127,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 153,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 12401053-40060347-2700-401112-005.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,40 zł, a kwartalnie — 44,20 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta PBK S.A., I Oddział Białystok, 11101154-401150015504.

Н!ўка



http://www.snchula.com/

Максім Макараў

Пра слана

Збіраў свае рэчы ў вандроўку і думаў, напэўна, мана,
Што можна ў горадзе Гродна сапраўднага ўбачыць слана[1].

Але неаспрэчныя факты сумненні мае адмялі.
Існуюць сланы ў Гародні як маманты колісь жылі.

Мне добрыя сябры сказалі, што слон той не еў і не спаў,
Калі ж я нарэшце прыехаў, мяне сваім крыкам вітаў.

Але як пабачыў то месца, дзе слон беларускі жыве,
Зласлівая думка пра помсту з'явілась у маёй галаве.

Яго засадзілі ў цямніцу, пазбавілі волі яго.
Мяне да слана прапусцілі, але без сяброў, аднаго[2].

Ён рвецца скрозь краты на волю! Увесь час яго маніць яна!
Хай знікне са свету ўлада, якая мардуе слана!

Каб вывучыць нашу прыроду патрэбна нямала гадзін.
Ёсць розныя зверы і птушкі, а слон у Беларусі адзін!

Радныя браткі-беларусы! І ў дзень і ў цемнай начы
Каб нас не праклялі нашчадкі, давайце слана берагчы!

Туга па Радзіме

Сярод дахаў чырвоных і стрэх, у германскай чужой старане
Як заплюшчу я вочы свае, Родны Кут кліча, кліча мяне.

Тут някепска жывецца, але не змагу ні на што прамяняць
Ту краіну дзе сябры мае распачалі сланоў вывучаць[3].

Для вялізарных гэтых жывёл мала месца ў нямецкай зямлі.
Тут амаль і не знойдзеш лясоў, дзе б сланы бестурботна жылі.

Каб застаўся я тут назаўжды, дык заглохла бы справа сяброў.
Беларусь жа мая для мяне ёсць другая радзіма сланоў.

[1] Ужо нельга, бо слон памёр. На момант напісання верша (1996 г.) гэты тэзіс быў цалкам актуальны.

[2] Позняй восенню 1996 г. дэлегацыі сталічных студэнтаў-элефантолагаў пасля ўсенароднага гуляння з прадстаўнікамі гродзенскай інтэлігенцыі хапіла грошай толькі на 1 (адзін) білет у заапарк.

[3] Маецца на ўвазе напісанне 27-томнай ілюстраванай энцыклапедыі пра сланоў (1993-94 гг.). На вялікі жаль аўтарскі калектыў распаўся, а выданне стала бібліяграфічнай каштоўнасцю.

Факты і высновы

Акцёры

Томаш Налэнч (віцэ-маршалак Сейма і старшыня следчай камісіі) пацвердзіў пераўтварэнне Сейма ў Сучасны тэатр:

— Гэта цана, якую плацім за яўнасць, — падкрэсліў.

Цана вялікая, а што з акцёрствам? Глядзі тэлесерыял „Рывін Гуд і Агора". Аматарства. Нуда.

Гуляць дык гуляць!

Узнікла элітарнае аб'яднанне — *Racławickie Centrum Wsi Polskiej*. Мэтанакіравалася стварыць на 17 гектарах *Wielkie Teatrum Bitwy Racławickiej.*

Кемлівых камедыянтаў у нас хапае, цаліны таксама. Гуляць дык гуляць!

— Нават за Бузка так не гулялі! — падскоквае Касцюшка ў небе.

Роўныя і раўнейшыя

Сярод варшаўскіх бомжаў будзе праведзены рэферэндум адносна ўступлення Польшчы ў Еўрасаюз.

Чаму толькі сярод варшаўскіх, беластоцкія не мараць пра масты Сены?

Лепэр папярэджвае

— З кім нам змагацца? З паліцыяй? Дык гэта ж нашы браты. Ім, як і нам, таксама цяжка. Звяртаюся да вас, паны камандзіры, не шчыруйце. Улада можа хутка змяніцца. Паглядзім, што тады скажаце.

Пажывем, паглядзім.

Сідар Макацёр

Прыбывайце ў мядзведжую старонку!

Зараз жа перад чарговым сходам уселяснога кіраўніцтва мядзведзь Сандар Жоржавіч страшэнна пакутаваў ад згрызоты. Прыгнятала яго тое, што не хоча ніхто наведваць мядзведжую старонку.

— У іншых паяўляюцца госці ці то з Франконскага лесу, ці з самога Шварцвальда, а нават і з адлеглых заморскіх лясоў. А ў нас — нікога. Я такі самотны! — мардаваўся думкамі мядзведзь.

Тым часам на паляне кіраўніцтва ўжо вычэквала. Стаяла цішыня, усе чысцілі свае лапы, упэцканыя перадвеснавою лясною граззю. Адно вавёрка Кацюша і дзяцел Стукач, прысеўшы на імху, толькі прыглядаліся гэтым гігіенічным захадам. Яны з адчуваннем нейкай брыдоты пазіралі на дзіка Свіналыча. Той, як заўсёды, рабіў усё наадварот, перакананы, што гэтак і трэба. Дык вось, адны вылізвалі свае лапы, а той бултыхаўся ў гразі:

— Заўсёды паспею вылізацца, — прамільгнула ў дзікавай мазгавешцы.

Аднак, не паспеў. Не заўважыў, як на паляну ўкаціўся Сандар Жоржавіч.

Свіналыч спалохана заматрашыўся.

— Вы, дзік, зусім нешыкоўны. Гэтак хочаце паказацца сусветнай звярыне? Брудным азадкам думаеце бліскаць?!

Дзік апусціў лыч.

— Гэта з-за вашых дурных звычак не хоча наведваць нас ніхто з іншых лясоў. А прыбываць да нас павінны! Трэба ім на ўласныя слепакі пабачыць, як у нас дрэвы прыгожа шумяць, і якая наша лясная брацця гасцінная, а мае законы паважаюцца, што місічак я, а не зголаднелая мядзведжая пачвара.

— Дык што рабіць? — нясмела шапнула лань Гаўрусіха.

— Добра, што пра гэта пытаеце вы.

Гаўрусіха спужалася.

— Не бойцеся! Вы — выдатна прэзентуецеся, не так, як гэты Свіналыч. Дзыгнеце, вось, за мяжу, у суседні лес, Палёнскі. Разведаеце, пагаворыце, пакажаце свае спраўныя путавыя костачкі дзе трэба і каму трэба. Скажаце, мядзведзь ёсць, ну, як там у іх кажуць — кулёвы. Cool?

— Як-як? — лань не ўцяміла.

— Няважна. Дзыгайце і спраўляйцеся.

— Ага, — прастагнала Гаўрусіха і азірнулася, ці хоць уселясная гразь дзе на ёй не засталася, бо як жа ж гэта так, каб з брудам у заходнелясны люд!

Лань памчалася. Кіраўніцтва разышлося. Мядзведзь Сандар Жоржавіч падаўся ў сваю бярлогу абдумваць існасць уселясное справы. Па дарозе, аднак, затрымаўся на хвіліну. Пільна азірнуўся. Наўкол — ніякае звярыны. Пацягнуўся і шчасна кінуўся ў разлівістую калюгу:

— Ай, як добра! Як добра! Расслабляюся, расслабляюся!..

Мядзведзь не прыкмеціў, як на верхавіне сасны, каля якое разлілася калюга, прысеў дзяцел Стукач.

— Ніхто ў госці не едзе?! Дзікая свіння вам нешыкоўная?! Дзюбак ад такога проста вісне! — клацнуў дзюбай Стукач і паціху паляцеў дзесьці ў бок здаўна прытоеных змяі Ссапіі і вужа Ззянона.

МакХолад

Адгаданка

1							2		3
				4	5				
		6		7				8	
			9						
		10				11		12	

Запоўніце вызначаныя дарожкі адгаданымі словамі (у дужках названы першыя літары іх). У светлых палях атрымаецца рашэнне адгаданкі.

1. хімічны элемент н-р 54 (К), 2. бацька Хама (Н), 3. частка драматычнага твора або ўстаноўчы дакумент дзяржаўных органаў і грамадскіх арганізацый (А), 4. невялікі лісцевы лес або прозвішча харвацкага прасветніка Людавіта (Г), 5. малая Анна (А), 6. у Беластоку Іакаў, у Бельску Грыгорый а ў Гайнаўцы Міран (Е), 7. бізун з дробных раменьчыкаў (Б), 8. збудаванне для пераезду цераз раку або горад на схіле Рудных гор у Чэхіі (М), 9. тэатр для паказу фільмаў (К), 10. польскі або іспанскі манарх (К), 11. вялікая драпежная неядавітая змяя трапічнай і субтрапічнай зон, якая абвіваецца вакол свае ахвяры і задушвае яе (У), 12. народнасць пражываючая ў паўночна-ўсходнім закутку Еўропы, якая карыстаецца мовай уральскай сям'і фінскай групы або аўтаномная рэспубліка ў Расіі з Сыктыўкарам (К).

(Ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, разыграем кніжныя ўзнагароды.

Рашэнне адгаданкі з 5 нумара

Лыжнае спаборніцтва.

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Лукашу Пацэвічу** з Беластока і **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў.

ISSN 0546-1960